Na końcu korytarza, błyszczącego nową beżową terakotą, urządzono kącik dla palaczy. Puszka po kukurydzy wypełniona jest niedopałkami po brzegi. Na przeciwległej ścianie ktoś namalował mazakiem wielkie, czerwone serce, ktoś inny podpisał na zielono: „Dla kogo to serce? Dla mnie?". Akademikowej atmosfery dopełniają muzyka, dudniąca z któregoś pokoju, i głośne śmiechy. Pawła Romańchuka, studenta pierwszego roku mechaniki budowy maszyn, zastałam pogrążonego w nauce przy komputerze. Jest on jednym z około stu studentów z Białorusi, uczących się na białostockich uczelniach. Paweł ma polskie pochodzenie. Tata, dziadek, babcia – wszyscy byli Polakami. Rodzina Pawła ma herb szlachecki i rozrysowane całe drzewo genealogiczne. Ojciec w dzieciństwie dużo opowiadał mu o polskości, uczył patriotyzmu. Dzisiaj Paweł uznaje się za Polaka, chociaż twierdzi, że jest w nim też coś białoruskiego.

– Bardzo chciałem studiować w Polsce – opowiada – głównie z powodów finansowych, ale też prestiżowych. Na Białorusi za studia trzeba sporo zapłacić, za darmo mogą studiować tylko prymusi. W Polsce życie lepsze, o tym wszyscy wiedzą. Na Białorusi nie mam czego szukać. Wielu moich znajomych, ukończywszy uniwersytet, ma trudności ze znalezieniem pracy. Oczywiście tych z najwyższą średnią wezmą, ale ich jest niewielu. Reszta pójdzie do college'u, po skończeniu trafi do jakiegoś do przedsiębiorstwa, ręce czarne, zarobione po łokcie, a dostaną grosze. Ja tak nie chcę. Nam, którzy kończymy naukę, trudno znaleźć pracę. Trzeba mieć dobre układy i znajomości, a ja mam całą rodzinę tutaj, w Polsce. Wcześniej przyjeżdżałem do Polski na zakupy, na koncert, odwiedzałem wujka w Warszawie. Wybrałem Białystok, bo bliżej mam do domu. Cały wrzesień uczyłem się jeszcze na uniwersytecie w Grodnie, a w październiku przyjechałem na Politechnikę Białostocką.

Pierwszą różnicą, którą zauważyłem, było to, że na Białorusi masz obowiązek notować na wykładzie. Kiedy tego nie robisz, wykładowca może zwrócić ci uwagę i poprosić o opuszczenie sali. W Polsce możesz robić co chcesz, bylebyś zdał potem zaliczenie. Jestem zadowolony z akademika, mamy jedną łazienkę na cztery pokoje, ale u nas na Białorusi jeszcze gorzej jest, karaluchy chodzą, nie wolno na własną rękę robić remontu w pokojach. O 12 w nocy już wychodzić nie możesz, a tutaj wracasz o której chcesz, może cię nie być nawet całą noc. Na początku często podchodziłem z prośbą o pomoc do wykładowców, we wszystkim mi pomagali. Jestem jedynym studentem z Białorusi w grupie. Stosunki w grupie układają się bardzo dobrze, z postawami nieżyczliwymi nie spotkałem się, niektórzy tylko są na „dzień dobry" i „do widzenia". Na początku miałem pewien problem z nazwiskiem, bo pisze się Romańchuk a czyta Romańczuk. Wykładowcy mieli problemy z odczytywaniem. Nie zauważam większej różnicy pomiędzy młodzieżą polską i białoruską. Integrujemy się bez problemów, chodzimy razem do miasta, do sklepu, do galerii. Byliśmy też na rynku. Chcieliśmy odwiedzić muzeum, ale jakoś czasu nie było. Bardzo mi się tu podoba, myślę że nie wrócę na Białoruś. Wolałbym zostać w Polsce, ale nie potrafię powiedzieć dlaczego.


Polskie pochodzenie ma także jego kolega – Eugeniusz Trocki, student II roku energetyki.

– Moi rodzice są Polakami, chociaż urodzili się i mieszkają na Białorusi. Tradycje polskie były w mojej rodzinie bardzo ważne. Od dzieciństwa obchodziliśmy wszystkie święta, czasem rozmawialiśmy po polsku w dni powszednie, a na święta to zawsze. Chodziłem do kościoła co tydzień. Stryjeczny brat mojej babci to arcybiskup Tadeusz Kondrusiewicz, miński metropolita. To zadecydowało o wyborze Polski na miejsce studiów, lepsze perspektywy na przyszłość, więcej możliwości znalezienia pracy, ułożenia sobie dobrego życia. Nie mam zamiaru wracać. Chciałem spróbować życia w Polsce, być bliżej Polski, polskości. Ani razu nie żałowałem, że tutaj przyjechałem. Nie uważam Białorusi za swoją ojczyznę. Grodno jest moją małą ojczyzną, tam się urodziłem, tam wyrosłem, ale to tutaj czuję się w ojczyźnie. Tęsknię tylko za rodziną. Na uczelni nie mam żadnych problemów, mam tutaj wielu kolegów, znajomych. Wrosłem już, gramy z chłopakami w piłkę nożną. Lubią wysłuchać mnie, pytają, dlaczego tu przyjechałem, dla nich to jest interesujące. Traktują mnie normalnie, nigdy nie miałem żadnych przykrości. Nie wiem jeszcze, co chciałbym robić w życiu, nie mam sprecyzowanych planów. Za pięć lat? Chcę skończyć studia, to najważniejsze, i znaleźć dobrą pracę w Polsce. Dziewczyny nie mam, ale chciałbym, aby była Białorusinką. Białorusinki są piękniejsze.

Ewa Zwierzyńska

Псеўданім у паэта быў Клён

Калі ў 1920-х—1930-х гадах Заходняя Беларусь апынулася пад Польшчай, амаль у кожнай беларускай вёсцы дзейнічалі падпольныя моладзевыя ячэйкі. Сябры ячэек, а гэта ў асноўным былі юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 15 да 25 гадоў, выступалі супраць вялікіх непасільных падаткаў, дамагаліся ад польскіх уладаў адкрыцця беларускіх школ, пісалі ці друкавалі на шапірографе лістоўкі і распаўсюджвалі іх па вёсках і хутарах, адкрывалі бібліятэкі-чытальні і г.д. Сярод актывістаў ячэек на Слонімшчыне ў той час быў і 17-гадовы юнак з вёскі Юхнавічы, Леанід Бялькевіч.



Леанід Бялькевіч „Клён”

Хлопец быў малапісьменны, бо не хапала грошай на вучобу. Таму самаадукацыяй займаўся сам. Вельмі шмат чытаў, асабліва любіў творы Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта яны натхнялі юнака самому паспрабаваць пісаць. Ён браў паперу, аловак і знікаў на некалькі гадзін. На ўлонні роднай прыроды, каля аднаго стройнага клёна, пісаў паэтычныя радкі. А потым іх акуратна перапісваў у асобныя сшыткі. А каб ніхто не здагадваўся, пад вершамі ставіў подпіс: Леанід Клён.

У той час па ўсёй Заходняй Беларусі пашыраўся патрыятычны рух, асабліва сярод беларускай моладзі. Пачала дзейнічаць легальная арганізацыя – Беларуская сялянска-рабочая грамада. Каб стрымаць яе рост, урад Пілсуцкага ў студзені 1927 года разграміў Грамаду. Пачаліся масавыя арышты грамадаўцаў і актывістаў.

У 1928 годзе на Слонімшчыне арыштавалі і Леаніда Бялькевіча. Спачатку яго прывезлі ў Міжэвіцкі пастарунак паліцыі, а потым у Слонімскую дэфензіву. Там юнака моцна катавалі. Паліцыянты стараліся біць Леаніда так, каб яму моцна балела і нідзе не было відаць знаку катаванняў. Яму клалі на грудзі дошку і па дошцы білі цяжкай жалезнай гірай. Вязень кашляў кроўю, а вонкавых прыкмет пабояў не было.

Пасля ўсіх здзекаў, Леанід хутка захварэў на сухоты. Але турэмшчыкі датэрмінова яго выкінулі з турмы, каб не памёр за кратамі. Пазней дэфензіўшчыкі так зрабілі і з другім слонімскім юнаком-змагаром за беларускасць Уладзімірам Бялько (1911-1933). Ён выдаваў падпольную газету „Піянер”, пісаў вершы. Юнака з вёскі Мяльканавічы таксама катавалі ў турме, а потым адправілі дамоў, дзе ён хутка і памёр. На жаль, „Піянера” і вершаў Уладзіміра Бялько не захавалася.

Вярнуўшыся з-за кратаў у родную вёску Юхнавічы, Леанід Бялькевіч радаваўся вясноваму сонцу, радаваўся, што паліцыя дома не змагла знайсці некалькі яго сшыткаў з вершамі, якія ён хаваў пад саламянай страхой. А там

былі напісаны вершы, прысвечаныя роднай прыродзе, вёсцы, сябрам, а таксама актывістам Грамады Максіму Бурсевічу і Браніславу Тарашкевічу. І хай яны не вельмі дасканалыя ў мастацкіх адносінах, але для гісторыі літаратуры яны маюць сваё гістарычнае значэнне, таму іх нельга выкінуць, як словы з песні. Вось некалькі радкоў, напрыклад, з верша, прысвечанага Браніславу Тарашкевічу:

Вельмі гоняць цябе часта,
Не даюць казаць прамоў,
Бо ты есць адзін з найлепшых
Беларускіх змагароў...
Гонар, гонар табе, браця,
Ад усіх тваіх братоў...
Ад усіх, што плачуць слёзна
Пад няволяй у паноў.

Пасля зняволення, Леанід Бялькевіч з кожным днём слабеў, сухоты грызлі яго цела. А 16 сакавіка 1931 года юнака не стала.

Пасля смерці Леаніда, яго старэйшы брат Іван шмат гадоў зберагаў сшыткі з вершамі Клёна. А калі не стала і Івана – сшыткі з рук у рукі перадаваліся жыхарамі вёскі Юхнавічы. А потым яны наогул зніклі. І толькі гадоў пяць таму, адна з вясковых жанчын прынесла ў рэдакцыю „Газеты Слонімскай”, дзе я працаваў, некалькі асобных спісаных чарнілам лістоў з вершамі юнака. Аказалася, што гэта лісты з тых самых сшыткаў вершаў паэта, якія ён захоўваў. На адзінаццаці ўцалелых лістах паперы прыгожым почыркам напісана шмат вершаваных радкоў. Яны вельмі розныя ў мастацкіх адносінах, але тэматыка іх даволі разнастайная. Гэта вершы „Зімняя ноч у вёсцы”, „Школа ў Мяльканавічах”, „У калыбелі”, „Беларуска”, „Раб” і іншыя. Пад некаторымі стаяць гады, пачынаючы з 1926-га і да 1931-га. Лежачы хворы ў ложку, Леанід Клён працягваў пісаць паэтычныя радкі і занатоўваць іх у свае сшыткі. Некалькі лепшых вершаў Леаніда Клёна прапаную чытачам „Czasopisu”.

Сяргей Чыгрын

У турме

Ледзь сонца часамі загляне
І вецер праз краты ўляціць,
Успомніцца дзень на паляне,
Як ярка раса зіхаціць.
Як птушка пад неба ўзлятае,
Вясёлую песню пяе.
О сэрца! Пара залатая –
Далёкія мары твае.
Пакінь успаміны на потым,
Хоць дні прад вачыма ўстаюць.
А мур прыціскае, каб з потам
Асесці на душу маю…
Смяюцца паганыя каты
Над доляй працоўных людзей.
На нашай крыві вы багаты, –
Расплата настане, прыйдзе!

1928 г.

Мы чакаем лепшых дзён

Неба бровы свае хмурыць,
Рассцілаецца імгла,
Адным словам, дзень пануры,
Нібы восень залягла.
Жыць без сонейка не міла,
Нібы цісне цяжкі сон,
Жыццё зблізжана з магілай –
Мы ж чакаем лепшых дзён.
І таму ў душы надзея
Узнялася, узрасла.
Чую: дух мой маладзее,
Хачу ветру просьбу слаць.
Падзьмі, ветрыку, з дубровы
Нам – пакутнікам зямлі,
Памажы сарваць аковы,
Каб свабодна зажылі…

1929 г.

Будзе прабуджэнне

Усё маўчыць наўкола,
Як бы паўмірала.
Што цвіло учора –
І таго не стала.
Але што жывое
З таго сну прачнецца,
Ветрам над зямлёю
Вольна пранясецца.
Траўку закалыша,
Хмаркі ў свет пагоніць.
Пыл рване на полі,
Ў лесе загамоніць…
То не сон-дрымота
Нас апанавала,
Гэту цемру сее
Панская навала.
Народ, узнімайся,
Разбівай кайданы!
Выпрамляйце плечы,
Хто быў закаваны!
Забурляць зноў рэчкі,
Зашумяць раслінкі,
Туманы рассыплюць
Дробных слёз расінкі.
Як у цёмных хатах
Жыццё марнавалі,
Ў гады маладыя
З голаду ўміралі.
Як гналі ў астрогі,
Каб думку скаваці,
Слёзы пралівалі
І сёстры, і маці.
Як над нашай песняй
Кпілі бессардэчна,
Як тапталі мову,
Каб знішчыць навечна.
Як свістала пуга
Па сялянскіх спінах,
Як хлеб забіралі,
А нам – еш мякіну.
Як мы ад хваробаў
Лячыліся самі,
Як мы з адным грошам
Ішлі ва ўсе крамы…
Ўсё складзем у песню,
Заспяваем смела,
Каб няслося рэха,
Над зямлёй грымела.

1929 г.

Развітанне

Усе лепшыя думкі і мары
Я у сшытак пасеяць хацеў,
Душою у творчым разгары
Усё ахапіць летуцеў.
Ды мала мне часу і сілы
Ўдзяліла ў змаганні жыццё.
Ў палёце апошні раз крылы
Свае я яшчэ распасцёр.
Не скажа ніхто, што я здрадзіў,
У бітве пакінуў сяброў.
Я гасну, як сонца у садзе,
Як промні, распырскваю кроў.

1931 г.

У гонар славянскай пісьменнасці – музыка і слова

Дні славянскай пісьменнасці, асноўны момант XII Падляшска-Палескіх сустрэч у традыцыі «Там по маёвуй росі», арганізаваныя 23 і 24 мая ў Бельску, прымеркаваны да дня ўшанавання памяці вучыцеляў славян святых Кірылы і Мяфодзія (24 мая), у юбілей 520-годдзя кнігі «Пралог» (найстарэйшай захаванай славянскай кнігі, якая ўзнікла ў 1496 годзе ў Бельску, змяшчаючай жыція святых), пачаліся ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах, Пакроўскай царкве ў Бельску. Пасля прайшоў адмысловы кніжны кірмаш. Прэзентавалася выстава пра бежанства, а таксама адбыліся канцэрты калектываў з Польшчы і Беларусі.

Дарафей Фіёнік, спецыяліст па мясцовай гісторыі, музейнай справе і фальклоры, старшыня аб’яднання «Музей малой айчыны ў Студзіводах», галоўнага арганізатара свята: – Ладзілі мы тут Кірмаш на святога Мікалая, цяпер ужо чацвёрты раз арганізуем мерапрыемства гістарычнага характару. Сёння Царква ўшаноўвае памяць святых Кірылы і Мяфодзія, творацаў славянскай азбукі. Старадаўні град Бельск мае доўгія традыцыі пісьменнасці. Ужо ў XIII стагоддзі ў Бельску былі кнігі, а ў XV ст. у Мікалаеўскім манастыры ў Бельску перапісвалі кнігі. «Пралог», самая старажытная захаваная бельская кніга на славянскай мове, якая ўзнікла ў Бельску ў 1496 годзе па заказе Солтана Салтановіча, захавалася да сёння. «Пралог» быў доўга ў Супрасльскім манастыры, а пасля трапіў у Маскву (цяпер ён у Маскоўскай гістарычнай бібліятэцы). Неўзабаве споўніцца 520 гадоў з часу, калі паўстала. З такіх феноменаў і будуецца гісторыя. Трэба выцягваць такія яркія падзеі, якія даюць нам падставу разглядаць Бельск як цэнтр пісьменства.Тое, што зараз у нас творыць столькі паэтаў і пісьменнікаў, што ў Бельску людзі вельмі любяць чытаць кнігі – гэта тая традыцыя, якая захавалася сотні гадоў. На нашай тэрыторыі ў суседнім Заблудаве і Супраслі таксама былі вялікія друкарскія традыцыі.

На кірмашы можна было купіць выданні Беларускага літаратурнага аб’яднання «Белавежа», Беларускага гістарычнага таварыства, Універсітэта ў Беластоку, выдадзеныя Праграмнай радай «Нівы», духоўную літаратуру прэзентаваную выдавецтвамі Варшаўскай праваслаўнай мітраполіі, «Братчыкам» з Гайнаўкі, Свята-Елізавецінскага жаночага манастыра і Праваслаўнага брацтва трох віленскіх мучанікаў з Мінска, Фондам імя князя Канстанціна Астрожскага ў Беластоку, выдавецтвам «Ортдрук» у Беластоку, Музеем малой айчыны ў Студзіводах і Інтэрнэт-Бібліятэкай «Камунікат». Прэзэнтаваліся таксама кніжкі выдавецтваў «Пагранічча» з Сейнаў, «Суседзі» з Беластока і «Стопка» з Ломжы.



Дарафей Фіёнік, выступаў пераапрануты за бельскага старосту Солтана Аляксандравіча, бацьку Солтана Салтановіча. Прапанаваў кнігу «Пралог», надрукаваную ў XIX стагоддзі, з такім самым зместам як у арыгінале з 1496 года.

Святкаванне распачалося ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах 23 мая з музыкалагічнага семінара «Даўняя царкоўная музыка і традыцыйны спеў Палесся». Вялі семінар Дарафей Фіёнік і спецыяліст па даўняй царкоўнай музыцы Марцін Абійскі, гайнавянін, дырыжор Камернага хора імя Багдана Анісімовіча пры Супрасльскім мужчынскім манастыры. У семінары прынялі ўдзел спевакі з вёсак



Музей друкарства і вытворчасці паперы з Супрасля паказаў даўнюю друкарскую працу. Юры Андраюк, які арганізаваў і вядзе музей, на друкарскім станку аддрукоўваў старонкі «Пралога» і раздаваў іх наведвальнікам мерапрыемства. Друкуе старонку «Пралогу» Міра Лукша

Сташаны Пінскага раёна і Леснікі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Царкоўнай музыкі, выконванай візантыйскімі мелодыямі, маглі мы ўчуць падчас багаслужбы ў Пакроўскай царкве ў Бельску.

Падчас свята кнігі дзевяностагадовы бларускі паэт ды публіцыст з Беласточчыны паэт Віктар Швед быў узнагароджаны ордэнам «За вернасць Бацькаўшчыне». Фундатарамі ордэну з'яўляюцца дзеячы беларускай культуры з Беласточчыны і Беларусі. – Узнагарода шчыра мяне ўзрушыла, – сказаў Віктар Швед. – Ніколі не спадзяваўся, што атрымаю ордэн. Тым больш важна, што гэта не дзяржаўны, а грамадскі ордэн. Гэта ацэнка маёй дзейнасці, за ўсе мае здабыткі, за ўсё тое, што я напісаў, 16 кніжак выдадзена, надрукавана звыш 4 тысяч вершаў у “Ніве” – гэта мае літаратурныя дасягненні, якія адзначаныя гэтай узнагародай.

Аўтарам ордэна «За вернасць Бацькаўшчыне» з'яўляецца вядомы дзеяч мастацтва ў Беларусі Мікола Кузміч.

Бяльшчан і гасцей захапіў вялікі музычны канцэрт на пляцы перад ратушай. Запрэзентаваліся: група гістарычнай музыкі «Гістрыён» і калектыў «Гаманіна», а таксама калектывы «Хацiславяне» і «Табала» з Хацiслава Маларыцкага раёна, калектыў сясцёр Лук'яновічанак з дочкамі з вёскі Леснікі, і калектыў «Чабатухі» з сяла Сташаны. Ад нас выступілі «Падляшанкі» з Гарадзіска, «Маланка» з Бельска-Падляшскага і «Жэмэрва» са Студзіводаў.

Тэкст і фота Міраславы Кастанчук



Падчас свята кнігі дзевяностагадовы бларускі паэт ды публіцыст з Беласточчыны паэт Віктар Швед быў узнагароджаны ордэнам «За вернасць Бацькаўшчыне»



Ордэн «За вернасць Бацькаўшчыне» выканаў заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікола Кузьміч з Брэста. Раней атрымалі яго Мікола Тарасюк з Палесся і Анатоль Краўчук з Падляшша. Фундатарамі ордэна з’яўляюцца вядомыя беларусы Палесся і Беласточчыны, якія састаўляюць яго капітул. Віктара Шведа з прысваеннем яму ордэна павіншавала вядомая бяльшчанка, паэтэса Надзея Артымовіч



„Солтан Аляксандравіч” і Віктар Швед



На пляцы перад бельскай ратушай было надта калярова




Бяльшчан і гасцей захапіў вялікі музычны канцэрт на пляцы перад ратушай



Барбара Гаральчык напісала раман пра бежанства. На здымку з Уладзіславам Петруком, які прапанаваў свае мастацкія альбомы



– Беласточчына цяпер гэта выдавецкі феномен, дзе вялікую актыўнасць праяўляюць беларусы – кажа дэпутат польскага Сейма Аляксандр Сасна (на здымку з травенскім нумарам Часопіса)



Календарыюм

Чэрвень – гадоў таму

496 – у 1519 г. Францыск Скарына выдае ў Празе „Кнігу Руф”, „Кнігу Эсфір”, „Кнігу Плач Ieраміі”.
355 – 28.06.1660 г. войскі Вялікага Княства Літоўскага і польскія разбілі каля вёскі Палонка, Слонімскага павету войскі расейскага агрэсара (камандуючы Іван Хаванскі).
190 – 7.06.1825 г. у Тургелях нар. Эдвард Паўловіч, мэмуарыст, мастак, асьветнік. Дзяцінства правёў на Наваградчыне, вучыўся ў Жыровічах, Слоніме, Слуцку. У Вільні вучыўся маляваньня ў Канута Русецкага і К. Рыпінскага, у 1853 г. закончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. З 1859 г. выкладаў у Наваградзкай гімназіі, у 1860 г. заснаваў самадзейны тэатр, пісаў карэспандэнцыі ў розныя газэты. За ўдзел у студзенскім паўстаньні быў сасланы ў глыб Расеі, у 1867 г. вярнуўся ў Наваградак. З 1870 г. жыў у Львове, дзе падрыхтаваў і выдаў каталогі фондаў музэя Любамірскіх. Пісаў успаміны, сярод якіх найбольш вядомыя: „Wspomnienia znad Wilii i Niemna” (1882). Памёр 10.02.1909 г. у Львове.
180 – 9(21).06.1835 г. у Пушках каля Дукштаў памёр Ян Рустэм (нар. у 1762 г. у Стамбуле), мастак, стваральнік Віленскай мастацкай школы. Вучыўся ў Варшаве ў Я. Норбліна і М. Бачарэлі і ў Нямеччыне (1788-1790). У 1798-1832 гг. выкладаў у Віленскім унівэрсытэце. Яго вучнямі былі м. інш.: І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, Я. Дамэль, Н. Орда, К. Русецкі, І. Хруцкі. Маляваў пераважна партрэты, м. інш.: Т. Зана, А. Сьнядэцкага, Я. Сьнядэцкага, Я. Лялевэля.
145 – выданьне у 1870 г. у Санкт Пецярбурзе „Слоўніка беларускай мовы” („Словарь белорусскаго наречія”) складзенага Іванам Насовічам.
120 – 12.06.1895 г. у фальварку Кур’янаўшчына Вілейскага пав. нар. Леапольд Родзевіч, беларускі драматург, тэатральны і нацыянальны дзеяч, друкаўся з 1912 г. ў „Нашай Ніве”, рэдагаваў беларускія газэты ў Вільні: „Беларускі Звон”, „Наша будучыня” (1922-1923), з 1921 г. дзеяч Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі, з 1923 г. у БССР, у гг. 1925-1934 – рэдактар газэты „Чырвоны сьцяг” і часопіса „Бальшавік”, працаваў у Камісіі па вывучэньні Заходняй Беларусі пры АН БССР, быў рэпрэсіраваны, праўдападобна расстраляны ў 1938 г. Аўтар п’ес: “Пакрыўджаныя”, “Блуднікі”, „Збянтэжаны Саўка”, „Пасланец”, „Багаты і бедны”, „Досьвіткі”, „Кавалі”, „Конскі партрэт”, зборнікаў вершаў: „Беларусь” (1922), „На паняволеных гонях” (1928), зборнікаў апавяданьняў “Рэвалюцыйным шляхам” (1928), “Вогнішча барацьбы” (1930).
115 – 14.06.1900 г. у в. Несьцеравічы, Ваўкавыскага павету нар. Міхась Забэйда-Суміцкі – сьпявак, пэдагог. Разам зь сям’ёй знайшоўся ў бежанстве ў Сібіры. У 1929 г. скончыў Харбінскі Унівэрсытэт. У 1935 г. вярнуўся на бацькаўшчыну. У 1936-1940 гг. быў салістам Варшаўскага Радыё. Адыграў вялікую ролю ў папулярызацыі беларускай музычнай культуры ў сьвеце. З траўня 1940 г. жыў у Празе, працаваў у Нацыянальным Тэатры. Утрымоўваў пастаянны кантакт зь Беларусьсю, Беласточчынай, выдатнымі людзьмі беларускай культуры (Р. Шырмам, М. Танкам, У. Караткевічам ды іншымі). Памёр 21.12.1981 г. у Празе, пахаваны на Альшанскіх могілках.
115 – 24.06.1900 г. у маёнтку Боркі, Слуцкага павету нар. Кузьма Чорны (сапраўднае прозьвішча Мікалай Раманоўскі, пам 22.11.1944 г.) выдатны пісьменьнік-празаік, драматург, публіцыст).
110 – 15.06.1905 г. у г. Веліж, Віцебскай губэрні. нар. Юрка Віцьбіч (сапраўднае прозьвішча Георгій Шчарбакоў) – пісьменьнік. Закончыў гімназію. Друкаваўся з 1929 г. У час нямецкай акупацыі праяўляў вялікую пісьменьніцкую актыўнасьць, ягоныя творы былі друкаваны ў многіх часопісах. Выдаў у той час два зборнікі публіцыстыкі „Вяліскія паўстанцы” ды „Нацыянальныя Сьвятыні”. У Нямеччыне ў 1946 годзе разам з Н. Арсеньневай стварыў літаратурнае аб’яднаньне

„Шыпшына”, якога стаў старшынёй. Пасьля жыў у ЗША. Актыўнасьць праяўляў таксама ў галіне журналістыкі. Многа ягоных твораў было надрукаваных у „Беларусе”, „Новым рускім слове”. Памёр 4.01.1975 г.

110 – 25.06.1905 г. у Пуцілкавічах каля Ушачы на Віцебшчыне нар. Пятрусь Броўка, выдатны беларускі паэт, пачаў друкавацца ў 1926 г. у газэце „Чырвоная Полаччына”; аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі, м. інш.: „Гады як шторм” (1930), „Паэзія” (1932), „Вясна радзімы” (1937), „Шляхамі баравымі” (1940), „Вершы і паэмы” (1946), „Далёка ад дому” (1960), „Вершы і паэмы” (1966), „Калі ласка” (1972), „Мая радзіма” (1985). Памёр 24.03.1980 г. у Менску.

90 – 26.06.1925 г. у Паўднёвым Востраве каля Крынак нар. Міхась Хмялеўскі, беларускі журналіст і грамадскі дзеяч. Звыш 30-ці гадоў працаваў у беластоцкай Ніве – ад самога яе пачатку аж да свайго адыходу на пенсію ў 1988 г. Быў таксама штатным дзеячам Беларускага Грамадска-Культурнага Таварыства. *Віншуем з юбілеем!*

90 – 25.06.1925 г. быў заснаваны ў польскім Сойме новы пасольскі клюб пад назовам Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада. Клюб даў пачатак партыі ды аграмаднаму грамадзкаму руху.

90 – 27.06.1925 г. у Нізку Узьдзенскага раёна на Меншчыне нар. Лідзія Арабей, беларуская пісьменьніца і літаратуразнавец, у 1956 г. выдала дасьледаваньне „Цётка (Алаіза Пашкевіч)”, аўтар зборнікаў аповесьцяў і апавяданьняў, м. інш.: „Мера часу” (1962), „Экзамен” (1963), „Ваўчкі” (1972), „Паласа дажджу” (1984), „Пошукі кахання” (1987).

80 – 3.06.1935 г. у Мачулішчы Крупскага раёна нар. Васіль Зуёнак, паэт, пачаў друкавацца з 1954 г., аўтар зборнікаў паэзіі, м. інш.: „Крэсіва” (1960), „Нача” (1975), „Маўчанне травы” (1980), „Світальныя птушкі” (1982), „Жніўны дзень: Выбранае” (1985), „Лета трывожных дажджоў” (1990).

65 – 6.06.1950 г. у Клянах Дубровенскага раёна нар. Аляксей Дудараў, сучасны беларускі драматург.

45 – 9.06.1970 г. у Нью-Ёрку памёр епіскап Беларускай Аўтакефальнай Царквы Васілій (Уладзімір Тамашчык – нар. 15.04.1900 г. у Вялікіх Азяранах на Беласточчыне), ад 20-ых гадоў звязаны з беларускім рухам у Польшчы і Чэхаславаччыне, у час II сусьветнай вайны дзейнічаў у Беларускім Камітэце ў Беластоку. Быў намесьнікам рэдактара „Новай Дарогі”, з 1944 г. на эміграцыі ў Нямеччыне; 23.04.1949 г. пастрыгся ў манахі і прыняў імя Васілій, з 1951 г. у ЗША, актыўны дзеяч беларускага царкоўнага і грамадзкага жыцьця на эміграцыі.

Апрацавалі **Лена Глагоўская** і **Вячаслаў Харужы**

Leon Moenke *Tundra*

6. Głęboki jar przeciął nam drogę. By się nie spotkać z ludźmi, których głosy rozlegały się ze wszystkich stron, pobiegliśmy w dół, nie bacząc na stracony trud wdzierania się na te wyżyny. Na dole, na brzegu szumiącego strumienia, za krzakami, sądziliśmy, że jesteśmy w bezpiecznym ukryciu i zatrzymaliśmy się na krótki odpoczynek i dla zaspokojenia pragnienia.

Zerwawszy przy okazji parę krzaków czernic, które teraz już nie wydały się nam tak smaczne i słodkie jak niegdyś, po krótkim odpoczynku rozpoczęliśmy znów wędrówkę w górę.

Po 10-15 minutach wyszliśmy z pasa przyrzecznych, dolinowych lasów na obnażone, porośnięte tylko mchem, góry – właściwą tundrę.

W dole pod nami szumiała rzeka ze swymi wodospadami i widać było chaty i białe namioty we wsi. W małym zagłębieniu pod skałą zatrzymaliśmy się na odpoczynek i naradę. A było nad czym naradzać się. Jaka jest obecnie nasza sytuacja i co dalej czynić?

Rozpoczęliśmy od stron dodatnich. Do tego usposabiało nas dotychczasowe powodzenie i przyjemne uczucie sytości. A więc: byliśmy już na drugim brzegu trudnej do przebycia rzeki, byliśmy nasyceni, odczuwaliśmy ciepło na całym ciele, a co najważniejsze – zapasy nasze były uzupełnione. Mieliśmy chleb, masło, ryby – czego mogło wystarczyć na dwa pełne dni. Była to zdobycz nie byle jaka.

Lecz sytuacja nasza miała i strony ujemne. O ile dotąd nikt nie wiedział o miejscu naszego pobytu, to teraz o naszym przebywaniu w tundrze wie już cała wieś, w której ponadto znajduje się posterunek GPU.

Jeśli wie cała wieś, to będzie widziało i GPU.

Ten wniosek przyprawił nas o silny niepokój. Groziła nam teraz pogoń.

„Kurier Wileński” nr 139, 22.05.1938 r., s. 8

Zadowolenie z powodu zaspokojenia głodu i zaopatrzenia się w prowiant prysło. Zaczęliśmy teraz oceniać wszystko z punktu widzenia bezpieczeństwa.

Mimo to nie żałowaliśmy decyzji przeprawienia się przez rzekę w łódce.

Innego wyjścia nie było. Byliśmy zbyt wyczerpani, by drogą okrężną szukać innej przeprawy. Przedsięwzięcie to było połączone z ogromnym ryzykiem, ale nie było jednak pozbawione nadziei na powodzenie.

Teraz, gdyśmy już nie byli głodni, ocenialiśmy nasz postępek jako szaleństwo.

Teraz dopiero zdawaliśmy sobie sprawę, jak nikłe mieliśmy szanse powodzenia. Pomimo całego sprytu i panowania nad sobą, zawdzięczaliśmy nasze powodzenie tylko tej okoliczności, że podczas naszego pobytu w chacie, nie zawitał do niej ani żołnierz GPU, ani żaden aktywny członek sielsowietu lub jakiś geolog z prawdziwego zdarzenia. Tak, był to wyjątkowy zbieg szczęśliwych okoliczności, któremu możemy zawdzięczać dobry efekt naszego szaleństwa.

Żeś role swe odegraliśmy bez zarzutu – o tym świadczy fakt, że mamy możność kontynuowania naszej podróży. Lecz czy dziś udało się nam całkowicie uśpić wszelkie podejrzenia i wątpliwości u spotkanych tam ludzi?

Wątpiliśmy w to. Wiele szczegółów z naszego pobytu w chacie włościańskiej zdawało się to potwierdzać.

Szczęśliwy koniec tej eskapady zawdzięczaliśmy głównie trzykilometrowej odległości naszej chaty od posterunku GPU i sielsowietu.

Uważaliśmy jednak za rzecz możliwą, że GPU już rozpoczęło poszukiwania.

Ewentualność pogoni stanęła przed nami w całej swej grozie.

Dzisiaj jeszcze musimy w jaki bądź sposób dojść do granicy, przejść te 20 kilometrów, które nas od niej dzielą – tak zdecydowaliśmy.

Wstaliśmy. Spojrzałem na niebo, by określić kierunek. Lecz na niebie nie było żadnego jaśniejszego punktu. Całe było zasłonięte czarnymi chmurami.

Zacząłem błądzić wzrokiem po wszystkich stronach, szukając jakichś wskazówek co do kierunku naszej dalszej podróży. Lecz na próżno. Przed nami i po bokach rozciągała się jednostajna, falista nico, pokryta mchami tundra. Ani śladu drzewa lub jakiegoś krzewu. Gdzie rzucić okiem, wszędzie jednostajne morze mchów. Tak trudnego do orientacji miejsca nie spotykaliśmy przez cały czas naszej włóczęgi.

Gdyś bezradni szukaliśmy jakiegoś wskaźnika kierunku podróży, lunął deszcz połączony z wichurą.

Musieliśmy się ukryć pod skałą, którąśmy niedawno opuścili.

Wiatr z ulewnym deszczem napawały nas nadzieją, że rychło to się skończy i znów ukaże się słońce.

Lecz wiatr ustał, a ulewa przemieniła się w drobny jesienny deszcz, któremu zdawało się nie będzie końca.

– Nie będziemy siedzieli tu w nieskończoność na oczach tej przeklętej wsi! – zawołałem i podniosłem się z miejsca.

Wlazłem na skałę, która służyła nam jako schronisko przed deszczem i znów zacząłem badac okolicę.

– Lonku, Lonku! – przerwała moje obserwacje żona. – Patrz, ścieżka! Ścieżka wydeptana ludzkimi nogami.

Gdy byłem zapatrzony w przestrzeń, ona tym czasem badała bezpośrednio otaczające nas miejsca.

Dokąd prowadziła ta ścieżka? Wydobyłem mapę. Mniej więcej dwadzieścia kilometrów na północny zachód od wsi, na brzegu morza, mapa wykazywała jakąś osadę. Nie mieliśmy wątpliwości, że ścieżka prowadzi do owej osady. Stamtąd odległość do granicy wynosiła zaledwie 10 kilometrów.

A więc mamy już szczegół orientacyjny.

Lecz czy można zeń skorzystać? Przecież, o ile zostanie zorganizowana pogoń, przede wszystkim skierowana zostanie na tę ścieżkę. Przecież to nie ulega wątpliwości.

A przypadkowe spotkania?! Przecież na to jest ścieżka, by z niej korzystali ludzie.

Staliśmy niezdecydowani.

Czy iść po tej pozbawionej wszelkich wskaźników orientacyjnych, gołej, monotonnej, pagórkowatej tundrze? Bez słońca? Na oślep?

Na pewno byśmy zbłądzili, poszli w niewiadomym kierunku i, kto wie, może trafilibyśmy na to samo miejsce.

Co począć? Nocować tutaj, w pobliżu tej wsi, gdzie wszyscy wiedzą o naszej wędrówce przez tundrę, nie miało najmniejszego sensu, tym bardziej że pogoń za nami była więcej niż pewna.

Pozostawać tutaj – to znaczy zginąć.

Zdecydowaliśmy kontynuować rozpoczętą dziś z rana grę „va banque".

Ruszyliśmy wydeptaną ścieżką. Nadziei na dojście dzisiaj do granicy nie było. Mieliśmy bowiem przed sobą nie 20, lecz 30 kilometrów.

A godzina już była późna. Była już czwarta (według naszego zegarka), gdy ruszyliśmy ścieżką.

Około godz. 6 wieczorem raptem spod nóg naszych z krzykiem frunęła kuropatwa. Ponieważ w pobliżu nas znów opadła na ziemię, można było z tego wnioskować, że jest ranna.

– Łap ją! – krzyknęła żona.

„Kurier Wileński" nr 140, 23.05.1938 r., s. 6

Rzuciłem się za ptakiem. Po krótkich wysiłkach miałem już go w ręku. Prawe skrzydełko było uszkodzone: zerwana skóra razem z piórami. Któż by to mógł uczynić? Czy jakiś drapieżny zwierz, czy ptak, czy też jakiś przechodzień uderzeniem kamienia zranił kuropatkę? Mniejsza o to. Najważniejsze to, że mieliśmy już ją w ręku. Ptak był wyjątkowo tłusty i duży. Było to bardzo solidne uzupełnienie naszych prowiantów. Znów los nam sprzyjał.

Po pewnym czasie, zatrzymawszy się na brzegu ruczaju, żona zajęła się dobiciem ptaka i wypatroszeniem go.

Zaledwie zdążyła rozpocząć te czynności, gdy zza wzgórza naprzeciw nas ukazały się jakieś trzy postacie. O ucieczce nie mogło już być mowy.

Należało kontynuować podróż, by rozmowa przy spotkaniu ograniczała się do wymiany paru zdań. Żona żwawo porwała za torbę podróżną, pomogłem jej zarzucić ją na plecy, i ruszyliśmy na spotkanie nieznajomym.

Po paru chwilach mogliśmy już wyraźnie rozróżnić, iż są to trzy kobiety. Miało to swe dobre i złe strony. Skoro są to baby, więc nie jest to władza, lecz za to posiadają przysłowiowe babskie języki… Jednak westchnęliśmy z ulgą. Bądź co bądź niebezpieczeństwo było mniejsze, niż mogłoby być przy innym spotkaniu.

– Dobry wieczór – zabrzmiało chóralnie, gdy dziewczęta zbliżyły się do nas.

– Dobry wieczór! – odpowiedzieliśmy i zatrzymaliśmy się, gdyż trzy nimfy zatarasowały nam drogę.

– Dokąd idziecie? – spytała jedna z nich.

Wymieniłem nazwę osady.

– Oj-jej! – odparła. – Do zmroku nie zdążycie. Będziecie zmuszeni przenocować w tundrze.

– A czy daleko jest jeszcze do wsi? – spytałem.

– Pół drogi. A kto wy jesteście? – spytała nie bez ciekawości.

– Badacze – geologowie. Złota i żelaza szukamy. Będziecie mieli dopiero kosy! – dodałem z uśmiechem.

– A ja was znam – zawołała dziewczyna radośnie – Wy jesteście Iwanow, już po raz drugi idziecie do nas. W roku ubiegłym jużeście wszak byli…

– Mylicie się. W roku ubiegłym nie ja byłem, był ktoś inny.

Nie przyznawałem się do znajomości, by nie wsypać się podczas dalszej rozmowy.

Towarzyszki jej z ciekawością przyglądały się naszej kuropatwie.

– Widzicie – rzekła żona – kuropatwę złapaliśmy rękami. Była ranna.

Nic nie mówiąc, dziewczęta z zazdrością spoglądały na naszą zdobycz.

– A dokąd wy idziecie? – spytała teraz kolejno.

Dziewczęta wymieniły nazwę wsi, którą żeśmy przed dwiema godzinami opuścili.

– Szczęśliwej drogi! – rzekłem.

– Wam również – odpowiedziały chórem.

Miałem wrażenie, że nasze odpowiedzi zostały przyjęte za dobrą monetę. Uwierzono nam.

– Bądź co bądź nie ulegało wątpliwości, że o tym spotkaniu za parę godzin będzie wiedziałą cała wieś. Nie mogło to ujść uwagi i GPU. Pogoń w ślad za nami po ścieżce nabierała coraz większych cech prawdopodobieństwa. Również niewykluczone było, że wieś, do której zdążaliśmy, zaalarmowana telefonicznie, wyśle swych ludzi na nasze spotkanie.

A słońce jak na złość nie chciało się wychylić zza chmur i nie pozostawało nam nic innego, jak uczynić wysiłek, by dojść do celu wcześniej i ukryć się w lasach, nim nasze nimfy staną w dolinie rzecznej.

Gnani tymi obawami bez odpoczynku kroczyliśmy dalej.

Zmierzch zapadał, gdy na horyzoncie ujrzeliśmy wyraźne sylwety gór. Podwoiliśmy wysiłki, by dziś jeszcze stanąć u mety.

Noc zapanowała już niepodzielnie, gdyśmy rozpoczęli schodzić w dolinę.

Kurier Wileński" nr 145, 28.05.1938 r., s. 6

Tundra w tym miejscu całkowicie zmieniła swój charakter. Zamiast falistego gruntu mieliśmy przed sobą skały i urwiska, a w zagłębieniach napotykaliśmy na błota i stawy.

W ciemności gubiliśmy drogę, wpadając w błota, to znów odnajdywaliśmy ją.

Chcieliśmy koniecznie zejść w dolinę, dojść do lasu i tam, ukryci przed wiatrem i oczami ludzkimi, pozostać na nocleg. Perspektywa nocowania tutaj, gdzieśmy się znaleźli, na tym odsłoniętym dla wszystkich wiatrów miejscu, nie uśmiechała się nam stanowczo. A po wtóre chcieliśmy dojść do wyznaczonej przez się mety.

Lecz w końcu doszliśmy do przekonania, że nie bacząc na przykrości z tym połączone, musimy pozostać na noc tutaj, na górze, o ile nie chcemy utonąć w błocie lub połamać sobie rąk i nóg.

Na domiar złego znów się rozpoczęła wichura z deszczem.

Znalazłszy względnie suche i zasłonięte skałą miejsce, rozlokowaliśmy się na nocleg.

Tak się zakończył ten obfitujący w przygody i wzruszenia dzień naszej podróży.

Skradamy się

Następnego dnia niebo się wypogodziło.

Szybko złożyliśmy nasze rzeczy i ruszyliśmy w drogę.

Miejsce zmieniło się do niepoznania. Góry urwiste otaczały dolinę.

Skradając się dotarłem nad brzeg urwiska i zacząłem badać okolicę.

Pod urwiskiem, w lewo od nas, po obu brzegach rzeki rzucona była dość duża wieś, ginąca za zakrętem. Za rzeką widniała znów goła tundra górska. Tylko w dolinie, wzdłuż rzeki i na pochyłościach górskich ciągnęły się błotniste łąki i cherlawe brzozowe lasy.

Postanowiliśmy okrążyć wieś z lewej strony, zbadać tę jej część, która pozostawała ukryta przed naszymi oczyma, i przeprawić się przez rzekę powyżej wsi.

Z tak ułożonym planem zaczęliśmy schodzić szparkim krokiem. Rychło w skalnych wąwozach natrafiliśmy na krzaki brzozowe. A jeszcze niżej – na zarośla lasu brzozowego.

Mówiąc o krzakach brzozowych i zaroślach, mam na myśli nie ścielącą się po ziemi i sięgającą zaledwie kolan człowieka roślinność, lecz bardziej wybujały gatunek brzozy, sięgający wzrostu człowieka, a nawet przekraczający go.

W niedużym wąwozie, na brzegu strumienia, rozlokowaliśmy się w dobrym humorze dla spożycia śniadania.

Podczas śniadania nie znajdywaliśmy słów uznania dla naszej wczorajszej gospodyni. Ryba była doskonała, a o chlebie nie było co i mówić.

Po obfitym śniadaniu, któreśmy popili doskonałą zimną wodą ze strumienia, ruszyliśmy dalej, brnąc wśród brzozowych zarośli.

Strumień skręcał w prawo, musieliśmy więc z nim się pożegnać i znów zaczęliśmy wchodzenie na górę. Poruszaliśmy się nadzwyczaj cicho, zachowując wszelkie środki ostrożności, nie mówiąc nic do siebie, a gdy zachodziła potrzeba zamienienia paru słów, mówiliśmy szeptem, ponieważ w każdej chwili spodziewaliśmy się spotkania z ludźmi.

Zaledwieśmy zdążyli wejść na wzgórze, gdy wtem, prawie tuż przy nas, rozległy się głosy kobiecy i dziecinny. Powstrzymaliśmy krok i przykucnęliśmy. Tutaj, mniej więcej dziesięć kilometrów od granicy, każde spotkanie z ludźmi było nader niepożądane.

Przykucnięci, prawie pełzając po ziemi, zaczęliśmy wymijać te głosy, wytężając słuch.

Z wielką ulgą skonstatowaliśmy po pewnym czasie, iż sąsiedzi zostali poza nami i oddalają się od nas.

Kurier Wileński" nr 146, 29.05.1938 r., s. 8

Było nam to bardzo na rękę, gdyż pionowe urwiska skalne zwisały już nad nami, a krzaki na pochyłości, na której żeśmy się znajdowali, stawały się coraz rzadsze. Skały przyparły nas do samej wsi. Nie tylko mogliśmy widzieć w najdrobniejszych szczegółach, co się dzieje na najbliższych podwórkach, lecz zupełnie wyraźnie słyszeliśmy wszystkie rozmowy, nie rozumiejąc oczywiście ani słowa.

Posuwanie się naprzód w tych warunkach było nadzwyczaj uciążliwe. Byliśmy zmuszeni przebiegać od krzaku do krzaku, chroniąc się poza nami. Było to nieustanne „Wstań – padnij!". Po każdym przebiegu, ukryci za krzakiem, pilnie badaliśmy, czy nie zauważono nas z pobliskich chat. Po stwierdzeniu, że ludzie nie przerywają swych prac, znów rzucaliśmy się do następnego, najbliższego krzewu. Była to stała zmiana porywczego, naprężonego ruchu i całkowitego bezruchu. Serce to zamierało w piersiach, to zdawało się, że wyskoczy gardłem. Nigdy jeszcze w życiu z taką siłą nie doznawałem tego uniżającego, podłego, tamującego dech w piersiach uczucia strachu, jak właśnie w chwilach okrążania wsi. To podłe uczucie bardziej dręczyło i wyczerpywało, niż wczorajszy „taniec nad przepaścią", oko w oko z przeciwnikiem.

Na domiar złego natrafiliśmy na psa. Gdzieś zupełnie blisko nad nami przy każdym przebiegu, przy każdym nieznacznym szeleście, wywołanym przez nas, pies zaczynał ujadać, paraliżując ruchy.

Czy był to pies myśliwski czy pasterski – nie mogliśmy się zorientować. Pianie koguta, następnie ryk krowi i beczenie kóz, naprowadziły nas na domysł, iż jest to pies wartowniczy, pilnujący ukrytej przed naszymi oczami chaty, zasłoniętej górą i drzewami.

Cdn ■

Калісь пісалі

Францішак Аляхновіч – сам аб сабе

2. У 1913 годзе – «Трохсотлетие Дома Романовых». Амністыя. Хапаю газэту. Прагавіта чытаю. Што за ліха! Першы артыкул падыходзіць пад амністыю, але «возложение хулы» (§ 73) засталося. А хочацца да хаты! Родная Вільня цягне... Еду назад. Зьяўляюся да пракурора. Арыштоўваюць. Судзяць. Даюць год вастрогу.

Сяджу – і пачынаю пісаць. Віленскія Лукішкі, як правільна адзначыў Максім Гарэцкі, былі імпульсам да мае літаратурнае працы.

У Коўні

1922 году. Хачу ехаць у Бэрлін. Паеду праз Коўню, бо туды эміграваў наш беларускі ўрад. Там мне памогуць атрымаць пашпарт.

У Бэрліне сядзіць Жылуновіч, якому даручана выдавецтва беларускіх аўтараў. Я чуў, што і маё нешта будзе друкавацца.

Атрымаў у Вільні пропуск. Зіма. Але я іду пехатой шляхам на Ятэлюны. Грошай на падводу ня маю.

На літоўскай граніцы прашу, каб тэлефанічна перагаварылі з беларускім урадам. Доўга ня могуць злучыцца. Нарэшце, кончана. Мяне пускаюць у Коўню.

Пакуль зробіцца пашпарт – трэба жыць. Шукаю работу. Якой-колечы работы. Іду да свайго віленскага знаёмага – дэкаратара дзяржаўнага тэатру Дудзекаса. Можа там квачом зараблю крыху грошаў.

Нажаль ужо мае памоцніка. Але дае добрую раду. Раіць мне пайсьці ў кабарэ. Прапануе сваю пратэкцыю.

«Новая Дарога», № 15(101), 9.04.1944 г., с. 2

Рэстаранны куплетыст

І вось, дзякуючы ягоным захадам, я пяю куплеты ў рэстаране Левінсона. Паскудная канура! Але што мне! Напляваць! Каб толькі пражыць, пакуль будзе пашпарт. Плоцяць добра і даюць вячэру. З кожнага вечару маю магчымасьць адлажыць крыху грошай на далейшую падарожжу. Беларускія куплеты маюць посьпех. Чарапук стараецца для мяне пашпарт.

Вось ужо заўтра будзе. Грошы маю. Заўтра разьвітаюся з рэстаранам Левінсона.

Але чаму сягоньня так шмат паліцыі ў рэстаране? Чаму гэта мае калегі глядзяць на мяне неяк незвычайна?

Скончыўшы свой гумар (я выступаў у канцы праграмы), іду распранацца. Гляджу: госьці ў мундзірах ужо мяне тут чакаюць.

– І як вам ня сорамна, грамадзянін Аляхновіч? Вы – беларускі пісьменьнік, і раптам займаецеся гэткімі бруднымі справамі!

– Ну, дык што-ж з гэтага! Перш-на-перш я выступаю тут пад псэўдонімам і ніхто з публікі ня ведае, што я – Аляхновіч, а падругое, я ня бачу, чаго мне тут сароміцца.

– Ну, «дурака не валяйце»! Вы добра ведаеце ў чым справа. Як вам, беларусу, ня сорамна быць на службе ў «другім аддзеле»[1]?

– Выбачайце, я на службе ў Левінсона, а не ў «другім аддзеле».

– Мы ўсё ведаем. Калі ласка, пойдзем з намі!...

Ізноў астрог.

Допыты.

– Чаго я прыехаў?

– Чаму я пяю ў шынку куплеты?

– Якое даручэньне мне даў «другі аддзел»… і гэтак далей.

«Мы ўсё ведаем...»

Не памаглі захады беларускага ўраду. Не памагла нават інтэрвэнцыя самога літоўскага міністра ўнутраных спраў. Дырэктар дэпартамэнту паліцыі ўпёрся:

– «Мы ўсё ведаем...» «Гэта наша тайна...» і гэтак далей.

Прышлося карміць вошы ў канцэнтрацыйным лагеры на Фрэдзе ў працягу 2-х тыдняў.

У канцы – апошнія допыты.

– Мы ўсё ведаем (кожная паліцыя заўсёды «усё ведае»!). Вас прыслаў сюды «другі аддзел». Ведаеце, што мы вам запрапануем, пераходзьце да нас на службу. Вы будзеце абясьпечаны, сям’я будзе абясьпечана...

– Але-ж пакіньце вы гэты «другі аддзел»! Ні з «другім аддзелам», ні з вамі не хачу працаваць!

– Цікава, чаму гэта вы выбралі гэты паскудны рэстаран Левінсона? Хіба-ж толькі дзеля таго, што там на гары ў гатэлі жыве польскі афіцэр «лончніковы»[2]..., каб лягчэйшы быў кантакт...

– Першы раз чую...

Вынікі допыту:

– Вы павінны ў 24 гадзіны пакінуць межы Ліетувы.

– Калі ласка, з прыемнасьцю...

Назад у Вільню

Ізноў назад, да граніцы – чыгункай, далей – пехатой у Вільню.

[1] „Другім аддзелам» называўся цэнтр польскай вывядова-шпіёнскай арганізацыі, якая старалася ўсюды мець сваіх агентаў. (заўвага мая. К. Езавітаў).

[2] „Лончніковы» – афіцэр сувязі (К. Ез.)

На польскім баку ў Ятэлюнах – не пускаюць:

– Ваш пропуск прасрочаны... Вам трэба было зьвярнуцца да польскага «лончніковага» афіцэра аб пралёнгату...

– Дык-жа я быў арыштаваны...

– Мы гэта ведаем...

– Дык як-жа я мог...

– Ну, вам аднак прыдзецца вярнуцца ў Коўню...

– Але-ж я туды не магу вярнуцца. Мяне там ізноў арыштуюць.

– Ну, пагавару з Вільняй па тэлефону.

Ятэлюнські начальнік пагаварыў па тэлефону. Гутаркі гэтай я ня чуў. Але адказ быў:

– Не пускаць Аляхновіча ў Вільню.

– Я назад не пайду! – заявіў я рашуча.

– Ну, тады мы вас адвядзем.

Прывялі мяне да нэўтральнага поясу й пакінулі.

Ужо зьмяркаецца. Сакавік. Мокры мяккі сьнег. Ногі вязнуць па калены. Дзіравыя мае боты прапускаюць ваду. Іду на нейкі ўзгорак. Разглядаю ваколіцу. Іду на Вільню.

Зморany, змоклы, празябшы, даўно ня голены...

«Кіпцюры ГПУ»

Аб сваёй савецкай злыбядзе – сямёх гадох у бальшавіцкіх вастрогах – я ўжо пісаў шмат у сваіх «Кіпцюрох ГПУ». Ужо нічога новага дакінуць няма. Адзначу толькі адну характэрную рыску: бальшавіцкія сьледаваці ўжо не абвінавачвалі мяне ў супрацоўніцтве з дэфэнзывай ці «другім аддзелам», а толькі ў «участии в организации или содействии организации, действующей в направлении помощи международной буржуазии».

Затое, пасьля выхаду майго на волю, калі я пісаў свае «Кіпцюры», пускалі мне праз сваіх агентаў чуткі, што я сам быццам заявіў аб сваёй сувязі з польскай «дэфэнзывай», а «дэфэнзыва» з свайго боку абвінавачвала мяне (таксама бальшавіцкі палец!) у супрацоўніцтве з ГПУ. (Глядзі: «У кіпцюрох ГПУ» – Эпілог, «Беларуская Газэта» у Менску, нумару не памятаю).

Нейкая путаніна, хаос, сьмех.

Дык няма дзіва, што, калі я ўлетку 1940 году раптам увечары пабачыў на вуліцах Вільні савецкія танкі, я ўцякаў, як звар’яцелы. Не заявіўшыся загадзя ў нямецкім пасольстве ў Коўне, я разам з трыма іншымі беларусамі папёр праз зялёную граніцу ў Нямеччыну. Мае таварышы былі разумнейшыя за мяне, бо яны загадзя зрабілі адпаведныя захады. Дык калі нас усіх пасадзілі ў вастрог у Сувалках, іх пасьля нейкага часу, пусьцілі ў Нямеччыну, а мяне перакінулі назад. Я ішоў уначы праз граніцу, арыентуючыся толькі па зорах, у той час, калі граніца ўжо была абстаўлена бальшавікамі.

Пад мястэчкам Кальварыяй спаймалі мяне літоўскія сяляне і хацелі аддаць у рукі бальшавіцкай улады, але ўдалося мне ўцячы і схавацца ў жыце.

Вярнуўшыся ў Вільню я блытаўся па знаёмых, кожную ноч начуючы у іншых людзей. Нарэшце ўдалося выехаць у Алкенікі на пасаду стоража.

Там было бясьпячней, чымся ў Вільні, але ня гэтулькі, каб ужо быць зусім спакойным. Дык няма дзіва, што першыя гукі ўзрываў нямецкіх бомбаў паказаліся мне цудоўнай райскай музыкай, якая пяе мне аб вызваленьні.

Ці злыбяды ўжо кончыліся? – Хто ведае. Але хіба што канец, бо і жыцьцё блізіцца да канца. Але – няма ведама: можа лёс, які так без пардону часта зьдзекваўся нада мной, не даючы мне аканчальна прапасьці, мае прыгатаваную ў запасе нейкую апошнюю штучку, якую прыгатаваў для мяне, як фінал.

Брр! Не дай Бог!

Ф. Аляхновіч.
Ліпень 1943 году.
Вільня.

Нябожчык Францішак Алекна-Аляхновіч (не) памыліўся ў сваіх прадчуваньнях: лёс сапраўды «меў у запасе апошнюю штучку» і падрыхтаваў для нашага драматурга нязвычайна трагічны фінал (заканчэньне) ягонае жыцьцёвае драмы.

У пятніцу 3-га сакавіка, а а 8-й гадзіне ўвечары, калі пісьменьнік у сваім хатнім габінэце працаваў над працягам успамінаў «Страшны год», што друкуюцца цяпер у часопісе «Новы Шлях», у дзьверы ягонай прыватнай кватэры па вуліцы Ясінскага № 18 нехта настойліва пастукаў.

Жонка пісьменьніка падыйшла да дзьвярэй і запытала: «Хто там?»

З калідору-пад'езду мужчынскі голас адказаў: «Грамадзянін з Менску, з лістамі і прывітаньнямі да дзядзькі Аляхновіча».

Францішка Аляхновіча часта наведвалі прыежджыя з розных мясцовасьцяў беларускіх. І хаця-ж кожная гэтая візыта адбірала ад нашага пісьменьніка шмат дарагога часу, ён заўсёды і ўсіх ветліва прыймаў, падоўгу гутарыў і дужа часта, калі прыежджаму ня было дзе спыніцца, пакідаў яго начаваць у сябе на дыване ў сваім невялічкім, але прытульным габінэце. Яму, які сам шмат туляўся па сьвеце, асабліва была зразумелай бездомнасьць чалавека ў чужым горадзе.

Дык, калі жонка пісьменьніка паведаміла яго аб прыежджым з Менску, Ф. Аляхновіч зараз-жа папрасіў яе, каб яна ўпусьціла нечаканага госьця ў хату і накіравала бы яго ў габінэт.

У габінэце Ф. Аляхновіч ветліва спаткаў «прыежджага з Менску», пазнаёміў яго з жонкай і запрасіў сесьці.

Жонка адразу-ж выйшла у сталовую парупіцца аб гарбаце.

Раптам у габінэце бухнулі адзін за адным тры стрэлы.

Жонка з плачам кінулася ў габінэт, але «госьць з Менску», выскачыўшы з габінэту і пагражаючы рэвальвэрам, загадаў ёй маўчаць, а сам кінуўся да выхадных дзьвярэй.

Калі яна прыбегла да мужа, ён меў сілу праказаць толькі адно слова:

«Пазвані...»

І тутака-ж, седзячы ў крэсьле пра пісьменным сталом, памёр ад сьмяротных ранаў. Акрываўленая галава пісьменьніка ўпала на лісткі ягонага апошняга рукапісу.

Гэтак без пары загінуў наш буйнейшы драматург, стаўшы ахвярай бязьмежнай беларускай даверлівасьці да людзей і старадаўняй беларускай традыцыйнай гасьціннасьці.

К. Езавітаў.
18.III.1944 г., Рыга.

«Новая Дарога», № 16(102), 16.04.1944 г., с. 4-5

Спадчына

Сярожа Пастушок на старонках „Заранкі”

Пад псеўданімам Сярожа Пастушок у канцы 1920-х – пачатку 1940-х гадоў у друку выступаў беларускі паэт Сяргей Крывец (1909-1945). Той самы Сяргей Крывец, які ў 1933 г. з Мастоўшчыны пераехаў у Беласток, дзе і пражыў свае апошнія 12 гадоў.

Язэп Палубятка ў беларускім беластоцкім тыднёвіку „Ніва” (12.02.2012) распавёў пра Сяргея Крыўца і пра яго беластоцкі творчы ўзлёт, а таксама апублікаваў нізку вершаў паэта, якія ён напісаў у Беластоку. Вершы гэтыя былі апублікаваны ў адзіным зборніку паэта „Дубок”, які пабачыў свет у мінскім выдавецтве „Беларусь” у 1972 годзе. Зборнік рыхтаваў і напісаў

прадмову да яго Рыгор Шырма пад рэдакцыяй Максіма Танка.

Праўда, Язэп Палубятка памыліўся, калі напісаў, што Сяргей Крывец у 1944 годзе, пасля вызвалення Беластока, быў мабілізаваны ў савецкае войска, а ў красавіку 1944 года, падчас штурму Гдыні, быў цяжка паранены, і 29 красавіка 1944 года памёр. Паэт, сапраўды, быў паранены, але ў красавіку 1945 года. Каля Гдыні яму адарвала нагу нямецкім снарадам, а 28 красавіка 1945 года ён у шпіталі памёр. Яму тады было толькі 36 гадоў.

Сяргей Крывец нарадзіўся ў вёсцы Дубна Гродзенскага павета (цяпер Мастоўскі раён). У 1915 года маці з дзецьмі выгналі ў бежанства ў Саратаўскую вобласць Расіі. У бежанстве хлопчык вучыўся ў школе, маляваў, сам пачаў вывучаць мовы. На Бацькаўшчыну Крыўцы вярнуліся ў 1921 годзе. Вяртанне было цяжкім і бедным. Сяргей наймаўся і ў пастухі, і ў парабкі, і ў цесляры.

У 1925 годзе юнака выбіраюць сакратаром гуртка Таварыства беларускай школы. Ён пачаў праводзіць шырокую культурна-асветную работу на вёсцы, шмат чытаў, пазнаёміўся з Рыгорам Шырмам, Максімам Танкам, іншымі літаратарамі Заходняй Беларусі. Самастойна вывучыў і добра ведаў беларускую, рускую, польскую і нямецкую мовы. А калі брат у яго спытаўся неяк, навошта яму нямецкая мова, Сяргей адказаў, што хоча ў арыгінале прачытаць Гётэ і Шылера.

У 1930 годзе Сяргей Крывец падаўся з вёскі ў Гародню, дзе ўладкаваўся працаваць цесляром, а потым пераехаў у Беласток. А ў 1940 годзе паступіў у Беластоцкі педінстытут.

У 1927 годзе ў Вільні пачаў выдавацца ілюстраваны дзіцячы часопіс „Заранка”. Рэдактарам-выдаўцом яго была Зоська Верас. У часопісе друкаваліся творы заходнебеларускіх пісьменнікаў, казкі, дасланыя чытачамі, вершы дзяцей, пераклады, малюнкі, розныя конкурсы і краязнаўча-пазнавальныя матэрыялы. Напісаў туды першае пісьмо ў 1927 годзе і Сяргей Крывец, але падпісаўся псеўданімам Сярожа Пастушок. Ён даслаў у рэдакцыю свой першы верш. У рубрыцы „Наша пошта” у № 7 з’явілася паведамленне: „Верш змяшчаем. Пішы, што будзеш рабіць зімой”. Верш „Што за шчасце, што за доля…” – гэта першы апублікаваны твор Сяргея Крыўца. Дарэчы, гэты верш чамусьці Рыгор Шырма не ўключыў у кнігу вершаў Сяргея Крыўца „Дубок”. Паэт у першым вершы марыў мець кавалак уласнай зямлі, карову, шмат збожжа, а таксама хацеў вучыцца ў беларускай школе:



Сяргей Крывец


Што за шчасце, што за доля
Меці свой кавалак поля,
Сваю ўласну ніўку,
Сваю хатку і садочак,
І гародчыку кусочак,
І коніка Сіўку.
Мець кароўку і цялушку,
Збожжа поўную кадушку,
Але я не маю
Ані хаткі ні гароду,
Ані нават свайго плоту.
І як жыць не знаю.
Каб я меў хоць сваю хатку,
Пакінуў бы ў дома матку.
І… у свет далёка…
У свет далёка я пайшоў бы,
Жыццё лепшае знайшоў бы,
Як Рыгор з Санока.
Чым па свеце валачыцца,
Лепей трэ было вучыцца
Разам з дзяцьмі ў школе.
Ні па-польску, ні па-руску,
Я хачу па-беларуску
На роднае мове.
Хоць не вераць цяпер людзі,
Але гэта праўда будзе,
Што мне часта сніцца,
Як дажджэмся сваёй волі,
Я не буду пасвіць болей,
А буду вучыцца.
Гэта надта велька крыўда,
Што мне трэба пасвіць быдла,
Але жыці трудна.
Бо не маю свайго поля,
Але прыйдзе лепша доля,
Хоць ідзе марудна.

Вясковы Пастушок быў вельмі ўзрадаваны першай пеблікацыяй, ён прасіў рэдакцыю, каб яму прыслалі часопіс. І нават на выданне адправіў каля 2 злотых. Рэдакцыя выслала яму „Заранку”. Але Пастушок не атрымаў. Ён зноў напісаў ліст і паведаміў, што „Заранку” так і не атрымаў. Тады рэдакцыя паўторна выслала часопіс Пастушку, а рэдактар часопіса Зоська Верас у рубрыцы „Наша пошта” паведаміла: „На гэты раз „Заранку” вышлем „палецоным” пакетам, мо’ хоць так яна дойдзе. 1зл. 70 гр. ад цябе атрымалі, таксама лісты, а „Заранка” ўвесь час пасылалася. Апроч таго былі высланы два лісты, як адказы на твае пытанні. Дзе гэта ўсё магло дзецца. Мо твой адрас не правідловы”.

Пазней Зоська Верас выслала Сяргею Крыўцу ўсе нумары „Заранкі” за 1927 год. Па першых вершах, паэтка і выдавец заўважыла, што на Мастоўшчыне жыве вельмі таленавіты самародак. Яе хвалявала, каб ён не знік, каб атрымаў пэўную адукацыю і меў працу. У „Нашай пошце” Зоська Верас пыталася: „Напішы нам, ці маеш магчымасць, хоць крыху вучыцца і ці ёсць дзе дастаць беларускія кніжкі для чытання? Прысылай нам сваіх вершаў болей. Ахвотна будзем



Адзін з нумароў часопіса „Заранка”, дзе пачынаў друкавацца Сяргей Крывец



Кніжка 4 ЗАРАНКА 11

Працы нашых чытачоў.

* * *

Моладзь, Моладзь, ўся надзея
Маткі Беларусі!
Наша першая ідэя:
Сьмелымі быць мусім.
Мусім стаць нагамі цьвёрда
На Родную Зямельку
З болям трэ' бароцца горда,
Змагчы труднасьць „вельку“*)
Мусім выставіці грудзі
Нявыгодзе сьмела,
Каб з нас потым выйшлі людзі,
Каб з нас вышла дзела.
Будзем слабых бараніці,
Праўды дамагацца,
І ў згодзі брацкай жыці,
За волю змагацца.
Дружна возьмемся за дзела
З раньняю зарою
І наперад пойдзем сьмела
Моцнаю сьцяною.
Гэй, да працы люд свабодны!
Браты і сястронкі,
Хай ляціць наш Гымн Народны
Ува ўсе старонкі.
Няхай зыкам сваім вольным
Ускалыхне паветра
Каб пачуў яго цьвет польны
Роднай пушчы нетра.

С. Пастушок.

Дубна, Сакавік.

*) Вялікую, у Горадзеншчыне ўжываюць слова „велькі“

Верш Сяргея Крыўца на старонцы часопіса „Заранка”, 1928 г., № 4

іх пераглядаць і што добрае змяшчаць. Шчыра жадаем табе, каб ты меў магчымасць вучыцца і развівацца” (1928, № 4).

У №4 за 1928 год на старонках часопіса быў апублікаваны яшчэ адзін верш Сярожы Пастушка пра моладзь. Яго таксама няма ў зборніку „Дубок”. Верш гучыць так:

Моладзь, моладзь, ўся надзея
Маткі Беларусі!
Наша першая ідэя:
Смелымі быць мусім.
Мусім стаць нагамі цвёрда
На родную зямельку,
З болем трэ’ бароцца горда
Змагчы труднасць вельку.
Мусім выставіці грудзі
Нявыгодзе смела,
Каб з нас потым выйшлі людзі,
Каб з нас вышла дзела.
Будзем слабых бараніці,
Праўды дамагацца,
І ў згодзі брацкай жыці,
За волю змагацца.
Дружна возьмемся за дзела
З раннняю зарою,
І наперад пойдзем смела
Моцнаю сцяною.
Гэй, да працы люд свабодны!
Браты і сястронкі,
Хай ляціць наш гімн народны
Ува ўсе старонкі.
Няхай зыкам сваім вольным
Ўскалыхне паветра,
Каб пачуў яго цвет польны,
Роднай пушчы нетра.

У 1929 годзе Сярожа Пастушок па-ранейшаму шчыра сябруе з „Заранкай”. А Зоська Верас у „Нашай пошце” ўсё пыталася: „… Ці ўжо вучышся ў сталяра? Пішы ў „Заранку”. І вясковы юнак пісаў. У першым нумары за 1929 год „Заранка” друкуе пераклад Сярожы Пастушка з польскай мовы абразка „Удзячнасць дзікага” на беларускую мову. Сюжэт абразка вельмі надуманы, але ён цікава чытаецца. Некалі беднай індыянцы адна жанчына ахвяравала залатую манетку. Прайшло шмат гадоў. І сын некалі беднай індыянкі стаў багатым чалавекам. Ён знайшоў тую жанчыну і прынёс ёй у знак падзякі за залатую манетку 25 тысяч франкаў. На дабро – адказаў дабром. Вось такі сюжэцік таго абразка, які пераклаў Сярожа Пастушок.

У 1931 годзе вясковы паэт дасылае ў „Заранку” загадкі і круцігалоўкі, якія сам складае і выдумляе. Першы нумар часопіса нават некаторыя з іх апублікаваў.

Але хутка „Заранка” спыняе сваё існаванне. А Сярожа Пастушок (Сяргей Крывец) пераязджае з роднай вёскі Дубна ў Гародню, а потым у Беласток.

Сяргей Чыгрын

Żubry spod ziemi

Turyści zwiedzający Muzeum Przyrodniczo-Leśne Białowieskiego Parku Narodowego w Białowieży natrafią w sali wystaw czasowych na kopię prehistorycznej rzeźby żubrów. Eksponat ten nie rzuca się specjalnie w oczy, można rzec – drzemie sobie spokojnie, przykryty patyną czasu, w kącie obszernej sali. Niemniej wart jest uwagi – to jedna z nielicznych na świecie kopii rzeźby w glinie, wykonanej przed 14 tysiącami lat p.n.e.



hominides.com

Prof. Henri Begouen w swoim gabinecie

Rzeźbę tę odkryto głęboko pod ziemią, w krasowej jaskini. Obecnie jest to jeden z najcenniejszych zabytków sztuki paleolitycznej, także najstarszy dokument dotyczący historii żubrów.

Jak doszło do odkrycia tej niezwykle cennej rzeźby? By uzyskać odpowiedź na to pytanie, musimy przenieść się nieco w czasie do południowo-zachodniej Francji, na teren departamentu Ariège.

Jest lipiec 1912 roku. Profesor prehistorii na Uniwersytecie w Tuluzie, znany badacz kultury magdaleńskiej hrabia Henri Begouen (1863-1956), postanowił właśnie urzeczywistnić swój plan spenetrowania podziemnego biegu rzeczki Volp (dopływ Garonny), wypływającej z jaskini Tuc d'Audoubert i przepływającej przez jego posiadłość. W lecie rwące wody Volpu nieco opadały i odsłaniały wnętrze pieczary, tak że można było przeniknąć do jej wnętrza.

Trzech synów profesora wyruszyło w głąb pieczary na sporządzonej przez siebie tratwie. Na razie – bez ojca! Po przepłynięciu kilkudziesięciu metrów okazało się, że dalsza żegluga jest niemożliwa ze względu na znaczne obniżenie sklepienia pieczary. Jednakże dokładne przyjrzenie się całemu wnętrzu groty ujawniło w ścianie otwór o szerokości kilku metrów, przy którym znajdowało się usypisko drobnych kamyków, wyniesionych z głębi skały przez prąd wody. Świadczyło to, że podziemie ma swój rozbudowany system.

Podziemni podróżnicy przedostali się przez otwór i już na samym wstępie dostrzegli szereg rysunków, wyrytych na wapiennych ścianach i załomach jaskini. Łatwo rozpoznali w nich sylwetki żubrów, reniferów i koni – typowych przedstawicieli fauny epoki lodowcowej, uwiecznianych w ten sposób przez ludy kultury oryniackiej i magdaleńskiej. Postacie zwierząt nosiły na sobie znaki strzał, oszczepów i harpunów. Przypuszczalnie zostały sporządzone w celach magii myśliwskiej.

Poinformowany o tym odkryciu profesor Begouen był wprost wniebowzięty, intuicja go jednak nie zawiodła! Ale na odkryciu tych naskalnych rysunków, bardzo cennych dla nauki, wyprawa się nie zakończyła. Jaskinia kryła w zanadrzu jeszcze inne, bardzo cenne niespodzianki. Odkrywcy przez całe trzy miesiące ostrożnie posuwali się w głąb rozgałęzionej pieczary, dokładnie badając jej wnętrze. W pewnym momencie dotarli do przegrody utworzonej przez stalaktytowe kolumny. W pierwszej chwili wydawało się, że tej przeszkody nie da się pokonać. Wyraźnie było widać, że przejście zostało zamknięte przed tysiącami lat i prawdopodobieństwo odkrycia za przegrodą śladów człowieka przedhistorycznego jest znikome. Synowie profesora postanowili jednak przebić wąskie przejście przez przegrodę. Udało się! Przed badaczami odsłoniły się dalsze korytarze, oglądali je oni dokładnie przez kilka dni.



„Ilustracja Polska” nr 34/1937

Kopia rzeźby żubrów z jaskini

W pewnym momencie na glinie wyścielającej dno jaskini dostrzegli ślady stóp ludzkich, a pomiędzy nimi odciski łap niedźwiedzia jaskiniowego. To była prawdziwa rewelacja! I jednocześnie nagroda za ogromny trud włożony w poszukiwania na bardzo trudnym obszarze badawczym.

Synowie profesora, ożywieni tymi fantastycznymi odkryciami, nie ustawali w dalszych poszukiwaniach. Wkrótce dotarli do ostatniej sali groty, położonej mniej więcej siedemset metrów od wejścia. I tu po raz któryś z rzędu zaparło im dech w piersi. Odkryli bowiem rzeźbę żubrów w glinie. Powróciwszy pod wieczór do domu, podekscytowani opowiedzieli ojcu o kolejnym znalezisku i gorąco namawiali go do udania się z nimi na to miejsce. Zapewniali żartobliwie: „Jakoś się ojca przepchnie".

Podekscytowany niezwykłym odkryciem profesor Begouen odważył się udać do jaskini. To był pamiętny dzień – 10 października 1912 roku. Synowie przy pomocy sznurów wywindowali ojca do sali z żubrami przez wybity w przegrodzie otwór. Jeden popychał go z dołu, a drugi ciągnął za ramiona. Profesorowi rozerwała się koszula, poniszczyły nieco spodnie, nie obeszło się też bez zadrapań na skórze, ale to co zobaczył, wynagrodziło mu całkowicie poniesione trudy.

Wieczorem tego samego dnia hrabia Begouen zatelefonował do swego nauczyciela, wybitnego francuskiego archeologa, profesora Émile Cartailhaca (1845-1921), który był znanym badaczem kultury magdaleńskiej, a także odkrywcą licznych grot ze śladami tej kultury. Begouen oznajmił archeologowi, że magdaleńczycy wykonywali również figury zwierząt w glinie. Odpowiedź Cartailhaca była krótka: przyjeżdżam! W dwa dni później, niezwykle wzruszony, oglądał już rzeźbę żubrów. Zdradził też, że jest to największa radość w jego życiu naukowym. Nie zważając na otarte do krwi ręce i kolana, powracał do tego miejsca jeszcze kilka razy.

Odkryta w jaskini Tuc d'Audoubert płaskorzeźba żubrów umieszczona jest na skale i ma podbudowę z kamieni i gliny. Sylwetki żubrów są półwypukłe. Samica mierzy 61 cm długości, samiec zaś – 63 cm. Ich wysokość – odpowiednio: 29 i 31 cm. Obie figury nie posiadają większych uszkodzeń – jedynie ogon krowy i róg byka uległy zniszczeniu. Zsychanie się materiału, z którego zostały wykonane, sprawiło, że obie postacie mają głębokie rysy pęknięć. Figury oddają właściwe cechy anatomii tych zwierząt, zachowują też proporcje ciała. Ich twórca musiał na własne oczy widzieć żubry i znać właściwości materiału, z którego je ulepił. Poza tym – miał duże zdolności artystyczne. Należy też mieć świadomość, że rzeźba powstała w niezwykle trudnych warunkach – w głębi jaskini, rozświetlonej jedynie mdłym ognikiem knota z mchu, zanurzonego w łoju zwierzęcym.

W 1923 roku czołowy speleolog francuski Norbert Casteret (1897-1987) odkrył w jaskini Montespant (dep. Haute-Garonne) kolejne 30 rzeźb innych gatunków zwierząt z okresu kultury magdaleńskiej, wykonanych także w glinie. Natomiast cztery lata później prof. Begouen natrafił w jaskini, którą od tego momentu zaczęto nazywać na cześć jej odkrywców – synów profesora, Grotą Trzech Braci (Grotte des Trois Frères), liczne wyroby z krzemienia, przekłute zęby zwierząt, ozdoby z kości niedźwiedzia, a pośród nich fragment kości żubra, jakby umyślnie zła-

Makieta pałacu prawie gotowa


Fot Jan Ciełuszecki

W listopadowym numerze Cz informowaliśmy, iż Roman Malinowski z Narewki od połowy września 2013 roku „buduje" z listewek ze sklejki z drzew liściastych makietę białowieskiego pałacu, w którym przebywali carowie, gdy przyjeżdżali na polowania w Puszczy Białowieskiej. Pracę przy makiecie planuje zakończyć w październiku tego roku. To zdjęcie było zrobione w końcu kwietnia 2015 roku. Potem wykona – takie są plany – makietę jednej z cerkwi parafialnych w gminie Narewka.

Makiety ciekawych pod względem architektonicznym budowli, skonstruowane przez pana Romana, można obejrzeć w jego domu. W 2014 roku były eksponowane m. in. w miejscowej galerii malarstwa i rzeźby.

Jan Ciełuszecki

manej, oraz kość renifera, na której wyrzeźbiono głowę żubra.

Specjaliści uważają, że jaskiniowe rysunki i rzeźby zwierząt miały magiczne przeznaczenie, wykorzystywano je w obrzędach związanych z myślistwem. Wierzono niegdyś, że każda żywa istota ma swego niewidzialnego sobowtóra, którego poprzez specjalne obrzędy magiczne można uwięzić w figurze lub rysunku tej istoty. Zadając jej wyobrażeniu ciosy lub składając przed nią ofiary, można było zapewnić sukces na prawdziwym polowaniu. Podczas obrzędów śpiewano i recytowano odpowiednie magiczne teksty.

Rzeźba żubrów z pirenejskiej jaskini Tuc d'Audoubert, w przeciwieństwie do rzeźb zwierząt znalezionych w jaskini Montespant, nie nosi śladów ciosów. Należy domniemywać, że zabieg magiczny w tym przypadku miał charakter hodowlany. Być może następowała jedna z kolejnych faz zlodowacenia, która pociągała za sobą emigrację lub zanikanie zwierząt łownych. Stada żubrów, głównych dostarczycieli mięsa, skór na odzież i rogów na narzędzia, stawały się coraz rzadsze. Starszyzna i czarownicy plemienia postanowili więc zbudować sanktuarium, w którym duchy stad obrzędowo uwięzione zmusiłyby żubry do powrotu. Pozostały nawet ślady dokonanego wokół rzeźby żubrów obrzędu w postaci odcisków stóp chłopców, którzy odbyli tutaj rytualny taniec.

W 1923 roku na zamówienie jednego z francuskich muzeów wykonano siedem gipsowych kopii rzeźby z Tuc d'Audoubert. Sześć z nich powędrowało do różnych muzeów na świecie. Staraniem Dyrekcji Naczelnej Lasów Państwowych jedną z kopii w 1937 roku zakupiono do białowieskiego muzeum przyrodniczego. Przed przetransportowaniem kopii do Białowieży, wystawiano ją przez parę tygodni w Instytucie Propagandy Sztuki w Warszawie.

Po przewiezieniu do Białowieży eksponat ustawiono początkowo w westybulu muzeum, a po wojnie przeniesiono do głównej sali wystawowej. W otoczeniu rzeźby umieszczono witraże z prehistorycznymi rysunkami, przedstawiającymi renifery, głowę dzikiego konia – tarpana, żubry i inne zwierzęta.

Kopię rzeźby prezentowano w tym muzeum do końca jego istnienia, tj. do 30 listopada 1971 roku. Po wybudowaniu nowego budynku muzeum i otwarcia w nim 27 czerwca 1972 roku nowej ekspozycji, rzeźbę umieszczono nieopodal wejścia na wystawę. Po przebudowie i modernizacji muzeum, rzeźbę początkowo eksponowano na holu wejściowym, później przeniesiono ją do sali wystaw czasowych.

Piotr Bajko

Успаміны з 1995 г.

***1.* Польшча.** **1 студзеня** Народны Банк Польскі правёў дэнамінацыю польскай валюты. Цяпер новы 1 злоты стаў каштаваць 10000 старых польскіх зпотых. 16 старых банкнотаў замянілі 5 новымі банкнотамі наміналам 10, 20, 50, 100 і 200 злотых. Друкавалі іх у Англіі. Старыя і новыя банкноты былі важнымі ў Польшчы яшчэ два гады. У студзені 1997 г. старыя банкноты страцілі важнасць і можна іх было выменіць на новыя ў вызначаных банках да 2010 г. Кошт замены старых банкнотаў на новыя ацанілі на 3 більёны старых злотых.

14 лютага прывезлі з Беларусі астанкі польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага і пахавалі іх у касцёле св. Яна ў Варшаве.

24 лютага ў Інстытуце ядзерных даследаванняў у Атвоцку-Сьверку выключылі першы польскі даследчы ядзерны рэактар Ева.

28 лютага паўстаў першы польскі Саюз Польскай Шляхты і Музей цацак у Карпачу.

1 сакавіка Сейм адклікаў прэм'ер-міністра Вальдэмара Паўляка з кааліцыйнага ўрада Саюза Левых Дэмакратаў (SLD) і Польскай Сялянскай Партыі (PSL), бо дайшло паміж імі да канфлікту, які распальваў прэзідэнт Лех Валэнса. Прэзідэнт хацеў, каб прэм'ер-міністрам урада стаў лідэр СЛД Аляксандр Квасneўскі і каб не стартаваў ён восенью ў выбарах на прэзідэнта.

Аднак **7 сакавіка** прэм'ер-міністрам урада Польшчы стаў Юзаф Алексы, а не Аляксандр Квасnеўскі.

7 красавіка пачала працаваць у Варшаве першая лінія метро ад Кабат да Палітэхнікі.

17 красавіка ад выбуху газу ў жылым будынку ў Гданьску-Стшыжа ля вул. Войска Польскага згінула 22 асобы. Дзень пасля выбуху разбурылі зусім гэты будынак, у якім нельга ўжо было жыць.

22 мая на адзін дзень прыляцеў з візітам у Польшчу папа рымскі Ян Павел II і адправіў імшу ў Скачове, а пасля сустрэўся з веруючымі ў Бельска-Бялай і ў Жыўцу.

Беспрацоўе ў першай палове 1995 г. паменшылася з 16,1% у студзені да 14,8% у чэрвені, інфляцыя паменшылася з 32,2 % да 27,8 %.

Беларусь

У лютым 1995 г. прэзідэнт А. Лукашэнка аб'явіў у Вярхоўным Савеце Беларусі аб намеры правядзення рэспубліканскага рэферэндума 11 красавіка па пытаннях прапанаваных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і мерах яго забяспячэння 13.4.1995 г. На галасаванне былі пастаўлены чатыры пытанні, першыя тры з іх – на абавязковы рэферэнндум, пастанова якога насіла канчатковы характар, а чацвёртае – на кансультацыйны,

пастанова якога насіла б рэкамендацыйны характар. Паставіў ён на рэферэндум наступныя пытанні:

1. Ці згодны Вы з наданнем рускай мове аднолькавага статусу з беларускай?

2. Ці падтрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь?

3. Ці падтрымліваеце Вы дзеянні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, скіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй?

4. Ці згодны Вы з неабходнасцю ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага ці грубага парушэння Канстытуцыі?

Раней 19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон „Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь", які зацвярдзіў бела-чырвоны-белы сцяг, а Закон з 19 верасня 1991 г. № 1086-XII зацвердзіў Пагоню афіцыйным гербам Рэспублікі Беларусь. У 1990 г. была прынята „Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых моў у БССР", якая прадугледжвала перавагу беларускай мовы ва ўсіх сферах функцыянавання беларускага грамадства.

Пры дапамозе рэферэндума А. Лукашэнка хацеў узмоцніць сваю ўладу і стаць папулярным у Расіі.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета большасцю галасоў назначылі рэферэндум на 14 мая і не згадзіліся на тры першыя пытанні. Тады Лукашэнка заявіў, што бярэ адказнасць за правядзенне рэферэндуму на сябе і пачаў гразіць, што спыніць дзейнасць Вярхоўнага Савета, калі ён не зменіць сваю пазіцыю. На знак пратэста дэпутаты фракцыі Зенона Пазьняка і Алега Трусава пачалі галадоўку ў зале пасяджэння парламента і засталіся там на ўсю ноч з 11 на 12 красавіка. Аднак ноччу па загаду прэзідэнта ў зал парламента ўвайшоў АМОН і працаўнікі службы прэзідэнта і яны выкінулі Пазьняка і Трусава з парламента і іх пабілі. Лукашэнка іх абвінаваціў, што яны быццам у парламенце з жанчынамі пілі гарэлку, што было хлуснёй. Пракуратура пачала весці крымінальную справу супраць тых, якія пабілі дэпутатаў, ды Лукашэнка не дапусціў, каб выкрылі віноўнікаў.

13 красавіка дэпутаты Вярхоўнага Савета пад націскам А. Лукашэнкі пры паўторным галасаванні прынялі пастанову № 3728-XII „Аб правядзенні рэферэндуму па пытаннях прапанаваных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і мерах яго забеспячэння", рэферэндум быў вызначаны на 14 мая, адначасова з першым турам галасавання па выбарам у Вярхоўны Савет.

12 красавіка Канстытуцыйны суд адмовіў Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і гістарычнай спадчыне прызнаць неканстытуцыйным вынясенне на рэферэндум пытанняў аб наданні рускай мове аднолькавага статуса з беларускай.

12 мая Беларускі народны фронт выпусціў заяўленне, у якім прасіў грамадзян прыняць удзел у галасаванні і галасаваць супраць.

14 мая прайшоў рэферэндум і па афіцыяльных даных у спісак грамадзян, якія мелі права ўдзельнічаць у рэферэндум, было ўключана 7.445.820 чалавек,бюлетэні для галасавання атрымалі 4.830.582 чалавек (64,8%), у галасаванні ўзялі ўдзел 4.823.482 чалавекі.

За першым пунктам галасавання выказаліся 4.017.273 асобы (83,3%) ад колькасці ўдзельнікаў галасавання або 53,9% усіх, хто меў права голасу, а супраць 613.516 асоб (12,7%) ад колькасці ўдзельнікаў галасавання, 192.693 бюлетэні былі неважных.

За другім пунктам прагаласавала 75,1% ад колькасці ўдзельнікаў галасавання (3.622.851 асоба), супраць 20,47% (988.839 асоб), 211.792 бюлетэні былі няважныя.

За трэцім пунктам прагаласавала 83,3% ад колькасці ўдзельнікаў галасавання (4.020.001 асоба), супраць12,5% (602.144 асобы), 201.337 бюлетэні было няважных.

За чацвётым пунктам прагаласавала 77,8% ад колькасці ўдзельнікаў галасавання (3.749.266 асобы), супраць 17.8% (857.485 асобы), 216.731 бюлетэнь быў неважны.

Вечарам пасля аб'яўлення рэзультатаў галасавання кіруючы справамі прэзідэнта Іван Ціцянькоў сам залез на дах дома ўрада, сарваў бела-чырвоны-белы сцяг і парваў яго на кавалкі.

28 чэрвеня Вярхоўным Саветам быў прыняты закон № 452-XII „Аб прызнанні страціўшых сілу заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнай сімволікі".

І ад часу рэферэндум бел-чырвона-белы сцяг і Пагоня маюць у Беларусі статус незарэгістрыраванай сімволікі і згодна з арт.167-2 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях забаронены да выкарыстання пры правядзенні публічных мерапрыемстваў.

Пасля рэкорднага павышэння цэнаў у жніўні 1994 г. – 53,4% за месяц у канцы 1994 г. у Беларусі пачалі праводзіць стандартную праграму стабілізацыі – на аснове рэкамендацыі Міжнароднага Валютнага фонду. Ва ўмовах гіперінфляцыі прадпрыемствы і гандлёвыя арганізацыі фармавалі цану не ў нацыянальнай валюце, а ў так званых умоўных адзінках ці ў доларах ЗША і пры дапамозе бягучага абменнага курсу доларавыя цэны пераводзілі ў беларускія рублі. Рост цэнаў пачаў запавольвацца і дасцігнута была рэзкая дынаміка паніжэння інфляцыі. Ад студзеня кожны месячны ўзровень інфляцыі паніжаўся і інфляцыя панізілася з 2221% у 1994 годзе да 330% да канца 1995 гола. У верасні банк выпусціў банкноты на 50 тысяч рублёў.

Ад 1995 года А. Лукашэнка пачаў уводзіць эканамічную палітыку сканцэнтраваную на ўтрымліванні старой гаспадарчай сістэмы. Мог ён гэта зрабіць толькі дзякуючы беспрэцэдэнтнай помачы з боку Расіі за палітыку абяцання паскарэння працэсаў інтэграцыйных дзвюх дзяржаў. Расія экспартавала ў Беларусь па абніжаных цэнах нафту і газ, а Беларусь перапрацаваныя прадукты з гэтай нафты экспартавала ў заходнія дзяржавы па рыначных цэнах і зарабляла. Быў уведзены бязмытны гандаль з Расіяй і Беларусь высылала ў Расію без мыта многа сваіх прадуктаў і Расія дала Беларусі крэдыты на прэферэнцыйных умовах. І хаця Беларусь не дабывала сваёй нафты і свайго газу, то 35-38% вартасці экспарту дзяржавы былі мінеральныя прадукты і асабліва прадукты з нафты.

28 мая прайшоў другі тур парламенцкіх выбараў. З-за малай прысутнасці выбаршчыкаў (64,8% у першым туры і 60,4 у другім) выбралі толькі 119 дэпутатаў. А трэба было выбраць не менш чым 174 дэпутатаў. У сувязі з гэтым пастанавілі правесці наступныя выбары 29 лістапада.

Расія

2 студзеня атрады чачэнскіх баевікоў адбілі атаку расійскай арміі на Грозны.

3 студзеня расійскія самалёты бамбілі ў Чачні касетнымі бомбамі горад Шалі.

6 студзеня падпісана згода на Мытны саюз між Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь.

7 студзеня патрыярх Маскоўскі і ўсёй Русі Алексій II і кіраўнік РФ Віктар Чэрнамырдзін палажылі камяні пад адбудову Храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве – пачаліся працы пры адбудове храма, які быў разбураны савецкімі ўладамі.

15 студзеня наступіла серыя выбухаў у Маскве. Бомбы выбухлі ў Маскоўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце, у фізіка-матэматычнай школе № 3254, у гасцініцы „Метрапаль” і ў трансфарматарнай падстанцы № 510 „Мосэнерга”. Ахвяр не было. Пасля выбухаў міліцыя атрымлівала ультыматумы ад „групы афіцэраў”, каб урад забраў войска з Чачні.

19 студзеня расійскае войска захапіла прэзідэнцкі палац у Грозным.

20 студзеня Беларусь, Казахстан і РФ падпісалі ў Маскве згоду на мытны саюз.

6 лютага ў Маскве на вул. Цёплы стан наступіў выбух 200 гр трацілу ў жылым доме. Ахвяр не было.

8 лютага прэзідэнт Чачні Джахар Дудаеў разам са сваімі ўзброенымі атрадамі пакінуў Грозны і баі вяліся на поўдні і на ўсходзе Грознага.

10 лютага ў катастрофе самалёта Ан-70 пад Барадзянкай у Кіеўскай вобласці згінула 7 асоб.

21 лютага быў падпісаны „Дагавор аб дружбе, добрасуседскім супрацоўніцтве” між Расіяй і Беларуссю на 10 год, які стаў падставай для стварэння Саюза Беларусі і Расіі.

1 сакавіка забілі ў Маскве тэлежурналіста Уладзіслава Лісцьева.

6 сакавіка камандаванне расійскай арміі аб’явіла аб паўпоўным кантролю над Грозным.

7 сакавіка ў Петрапаўлаўскім саборы ў Санкт-Пецербургу былі ўрачыста перапахаваныя астанкі вялікага князя Кірыла Уладзіміравіча і яго жонкі Вікторыі Фёдараўны, якія ўмерлі ва Францыі ў канцы 1930-ых гадоў.

10 сакавіка пачаліся цяжкія баі ў Чачні за вёску Бамут.

13 сакавіка ў Калінінградскай вобласці ў Куршскім заліве адарвалася льдзіна з рыбакамі і плыла ў бок Літвы. На ёй было больш чым 500 рыбакоў, якіх пачалі ратаваць верталёты. Згінула не менш чым 80 рыбакоў.

14 сакавіка выляцеў у космас расійскі касмічны карабель Саюз-ТМ-21 з касманаўтамі Уладзімірам Дзяжуравым, Генадзіем Стралковым і з касманаўтам ЗША Норманам Тагардам. Саюз ТМ-21 прыстыкаваўся да касмічнай станцыі „Мір”, да якой 29 чэрвеня даляцеў і прыстыкаваўся амерыканскі „Атлантыс”, які пасля забраў усіх касманаўтаў з Саюза ТМ-21, а пакінуў прывезеных расійскіх касманаўтаў Анатолія Салаўёва і Мікалая Бударына на касмічнай станцыі „Мір”, і вярнуўся на зямлю 7 ліпеня. Касманаўты з „Атлантыса” Анатолій Салаўёў і Мікалай Бударын вянуліся на зямлю на касмічным караблі Саюз ТМ-21 11 верасня.

16 сакавіка Арменія і Расія падпісалі дагавор, што расійскае войска будзе далей у Арменіі.

22 сакавіка вярнуўся на зямлю расійскі касмічны карабель Саюз ТМ-20 з касманаўтамі Аляксандрам Віктарэнкам, Аленай Кандраковай і Валерыем Паляковым. В. Палякоў устанавіў рэкорд пражывання ў космасе – 437,7 дзён.

З **7 на 8 красавіка** расійскае войска ў баях заняло ў Чачні вёску Семашкі, у якой застрэлілі амаль 100 яе жыхароў.

8 красавіка пры пасадцы ў Петрапаўлаўску- Камчацкім разбіўся самалёт Іл-76. Згінула 14 асоб.

29 красавіка прэзідэнт РФ Барыс Ельцын падпісаў Закон № 69-ФЗ аб прадаўжэнні ваеннай службы прызыўнікоў у арміі з 18 да 24 месяцаў.

10 мая пасля парада на Паклоннай гары на 50 гадавіну Дня перамогі ў другой сусветнай вайне пачаліся расійска-амерыканскія перагаворы між прэзідэнтамі Барысам Ельцыным і Білам Клінтанам, якія падпісалі пяць сумесных заяў, між іншымі аб эканамічных сувязях і аб рэжыме супрацьракетнай абароны. Перагаворы аб пашырэнні НАТА адклалі да кастрычніка.

26 мая ад землятрусу ў Нефцегорску на Сахаліне пасёлак Нефцегорск быў зусім знішчаны.

23 чэрвеня прадстаўнікі Чачні і Расіі дагаварыліся аб

часовай мірнай згодзе, пасля якой чачэнскія паўстанцы мусяць зложыць сваю зброю, а ўсе 8 тысяч расійскіх салдат пакінуць Чачню, а ў верасні ў Чачні бубуць праведзены выбары.

29 чэрвеня ноччу на 25 кіламетры Кашырскага аддзялення Маскоўскай чыгункі невядомыя асобы разабралі чыгуначныя рэйкі.

Іншыя дзяржавы

1 студзеня ў Босніі і ў Герцагавіне пачаўся мір падпісаны 31 снежня 1994 года.

1 студзеня ў Еўрасаюз уступілі Аўстрыя, Фінляндыя і Швецыя.

6 студзеня ў сталіцы Філіпінаў Маніліі, дзякуючы пажару кватэры тэрарыста, выкрылі загавор на жыццё папы рымскага Яна Паўла II і аперацыю „Боінка" ў якой тэрарысты хацелі знішчыць 11 пасажырскіх самалётаў над Ціхім акіянам.

6 студзеня ў катастрофе самалёта ў Іране згінуў камандзір авіяцыі Ірана Мансоур Саары і 12 афіцэраў.

10 студзеня ў катастрофе самалёта de Havilland Canada Twin Otter 300 у моры ля вострава Флорэс (Інданезія) згінула14 асоб.

10 студзеня ў катастрофе самалёта Дуглас ДЦ-9 у Картахене ў Калумбіі згінула 51 асоба. Выжыла толькі дзевяцігадовая дзяўчынка.

11 студзеня папа рымскі Ян Павел II пачаў візіт на Філіпінах.

17 студзеня ад моцнага землятрусу ў Кобе ў Японіі згінула 6434 асобы.

20 студзеня ў катастрофе самалёта Dassault Falcon 20E у Буржэ ва Францыі згінула 10 асоб.

22 студзеня ад выбуху бомб на аўтобусным прыпынку ў Ізраіле згінула 19 ізраільцян, а 69 было параненых. Бомбу падлажылі 2 члены ісламскага Джыхада.

25 студзеня выстрэленая ў паўночнай Нарвегіі ракета з амерыканскім зондам амаль не давяла да выбуху III сусветнай вайны.

26 студзеня пачалася вайна між Эквадарам і Перу, якая закончылася 28 лютага.

30 студзеня моцны дождж у паўночна-заходняй Еўропе змусіў 250 тысяч нідэрландцаў пакінуць свае дамы і перасяліцца, бо была пагроза, што выйдуць з берагоў рэкі гэтага рэгіёна. Эвакуацыя праходзіла да 1 лютага.

30 студзеня шафёр-каміказе ўехаў ў Алжыры машынай напоўненай сотнямі кілаграмаў тратылу ва ўход будынку штаба паліцыі. Ад выбуху згінулі 42 асобы, а 286 асоб было параненых.

3 лютага наступіў 67-ы старт (STS-63) па праграме Спейс шатл і 20 палёт шатла „Дыскаверы" з касманаўтамі Джэймсам Уезербім, касманаўткай Айлінай Колінз, Бернардам Харнсам, Майклам Фоўлам, Джэнісам Восам і расійскім касманаўтам Уладзімірам Цітовым. „Дыскаверы" прыблізіўся на 10 метраў да расійскай касмічнай станцыі „Мір". «Дыскаверы» вярнуўся на зямлю 11 лютага.

21 лютага ў Эстоніі быў прыняты Закон аб мове.

25 лютага ад выбуху бомбы ў цягніку, які вёз салдат, у індыйскім штаце Асам згінула 27 асоб.

27 лютага на перапоўненым людзмі базары ў Іраку наступіў выбух бомбы ў аўтамашне, ад якой згінулі 94 асобы. Пасля паліцыя арыштавала трох іракскіх курдаў.

2 сакавіка наступіў 68 старт (STS-67) па праграме Спейс шатл і 8 палёт шатла „Індэвор" з касманаўтамі Стэфенам Освальдам, Уільямам Грэгорым, Джонам Грунсвельдам, Уэнды Лоўрэнс, Тамарай Джэрніган, Рональдам Парызем і Сэмюэлем Дурэнсам. Вярнуліся яны на зямлю 18 сакавіка.

5 сакавіка на парламенцкіх выбарах у Эстоніі перамогу атрымала Нацыянальная кааліцыя створаная з былых камуністаў і Сялянскі народны саюз.

17 сакавіка ва Украіне прынялі Закон „Аб Аўтаномнай Рэспубліцы Крым". Закончыў ён сепаратызм рускіх жыхароў. Ён ліквідаваў пасаду прэзідэнта Аўтаномнай Рэспублікі Крым і не дапускаў да дзейнасці супраць Канстытуцыі Украіны.

20 сакавіка рэлігійная секта„Аўм Сінрыке" заатакавала газам метро ў Токіо. Згінула 12 асоб, а пацярпела больш чым 1000 людзей.

20 сакавіка парушана перамір'е ў Босніі і Герцагавіне. Баснійская армія пачала атакаваць пазіцыі баснійскіх сербаў. Тады сербы напалі на дзяржаўнае войска і гарады, у якіх жылі мусульмане. Баі між мусульманамі і сербамі закончыліся 30 сакавіка.

26 сакавіка 7 дзяржаў Еўрасаюза (Бельгія, Францыя, Германія, Люксембург, Нідэрланды і Іспанія) ліквідуюць на граніцах ўнутраны кантроль паміж імі і ўзмацняюць на граніцах кантроль паміж імі і іншымі дзяржавамі.

27 сакавіка насельніцтва Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі прагаласавала, каб на яе тэрыторыі было расійскае войска.

31 сакавіка ў катастрофе самалёта Аэрбуса А310-324 лініі ТАРОМ у Румыніі згінула 60 асоб.

9 красавіка ў сектары Газа ад выбуху бомбы ісламскіх баевікоў згінуў адзін амерыканец і 7 ізраільскіх салдат.

17 красавіка – 12 мая прайшла ў Нью-Йорку канферэнцыя дзяржаў, на якой прадоўжылі бестэрмінова Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

19 красавіка пры тэракце ў Аклахома-Сіты ад выбуху адміністрацыйнага будынку згінула 168 людзей.

19 красавіка ў Японіі ў Іокагаме на адной чыгуначнай станцыі у перапоўненым цягніку нехта ўпусіў газ фозген. У бальніцы папала амаль 370 асоб.

29 красавіка 95% галасуючых у рэферэндуме у Ка-

захстане пажадала прадоўжыць тэрмін паўнамоцтва прэзідэнта Нурсултана Назарбаева да 2000 года.

1 мая харвацкая армія і паліцыя ўвайшлі ў заходнюю Славонію і на працягу некалькіх дзён захапілі яе і забілі ў ёй пры гэтым амаль 200 сербаў.

2 мая пасля захопу харватамі Славоніі сербы абстралалі Заграб. 7 асоб згінула, а 175 асоб было параненых у Заграбе.

7 мая ў другім туры выбараў выбралі ва Францыі прэзідэнтам Жака Шырака, які атрымаў 52, 6% галасоў.

24 мая ў катастрофе самалёта Embraer Bandeirante 110PI у Вялікабрытаніі ля Хервуда гіне 12 асоб.

2 чэрвеня дайшло да згоды між прэзідэнтам Расіі Б. Ельцыным і прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмай пры падзеле былога савецкага Чарнаморскага флота.

2 чэрвеня сербская зенітная артылерыя збіла над Босніяй амерыканскі самалёт Ф-16.

13 чэрвеня прэзідэнт Францыі Жак Шырак аб'явіў, што Францыя правядзе 8 ядзерных выбухаў на атоле ў Ціхім акіяне. Францыя парушыла ўласны мараторый на ядзерныя спробы з 1992 года.

14 чэрвеня баснійскае дзяржаўнае войска пачынае весці генеральнае наступленне на пазіцыі узброеных сіл баснійскіх сербаў. Тады баснійскія сербы пачалі абстэльваць Сараева.

23 чэрвеня ў Сеуле ў Паўднёвай Карэі раптоўна разбурыўся ўніверсам, пад абломкамі якога згінула 521 асоба.

27 чэрвеня наступіў 69 старт (STS-71) па праграме Спейс шатл і 14 палёт шатла „Атлантыс” з касманаўтамі Робертам Гібсонам, Чарльзам Прэкортам, Алінай Бейкер, Грыгорым Харбом, Бонім Данборам, рускімі касманаўтамі Анатоліем Салаўёвым і Мікалаем Бударыным. Наступіла першая стыкоўка „Атлантыса” з расійскай касмічнай станцыяй „Мір”. Расійскія касманаўты Анатолій Салаўёў і Мікалай Бударын затрымаліся на касмічнай станцыі „Мір” і вярнуліся на зямлю на расійскім касмічным караблі „Саюз ТМ-21” 11 верасня, а „Атлантыс” забраў на іх месца касманаўтаў з касмічнага карабля „Саюза ТМ-21”, амерыканскага касманаўта Нормана Тагарда і расійскіх касманаўтаў Генадзія Стралкова і Уладзіміра Дзяжурава і вярнуўся на зямлю 7 ліпеня.

Дзмітры Шатыловіч

Працяг будзе

Powrót bieżeńców

Sześcioletnia Dominika, choć do torów, do stacji kolejowej w Syczach, jest z Moszczony Pańskiej zaledwie kilka kilometrów, nigdy wcześniej nie jechała pociągiem. Teraz siedzi od kilkunastu dni w towarowym wagonie razem z rodzicami i dwójką rodzeństwa, a skład wtacza się właśnie powoli na most nad rzeką, która wygląda jak morze. To Ob. Jedna z największych syberyjskich rzek. Ale pociąg, w którym jedzie mała Dominika, toczy się dalej. Zatrzymuje się dopiero nad kolejną wielką rzeką, której nazwa brzmi obco, niezrozumiale. Irtysz. Miasto nazywa się Omsk. To największe z miast, w którym przyszło Dominice mieszkać. 3800 kilometrów od rodzinnej Moszczony Pańskiej. Był rok 1915.

Sto lat później w Białowieży oglądam wystawę po tytułem „Bieżeństwo. Niezwykła historia zwykłych ludzi”. W miejscu, gdzie przed stu laty stał carski pałac, w którym pobywał Jego Wysokość imperator Rosji car Mikołaj II, człowiek, którego jedno słowo, jedna decyzja, skazała na tułaczkę po bezkresach Rosji prawie 3 miliony mieszkańców wschodnich guberni Cesarstwa, głównie prawosławnych Białorusinów i Ukraińców. Miliony ludzi stały się zakładnikami wojennych planów szalonych strategów, którzy swoim koncepcjom „spalonej ziemi” nie zawahali się podporządkować losów całych rodzin, całych wiejskich społeczności, dla których w jednej chwili zawalił się… cały świat.

Trzynaście tablic z fotografiami

Przez lata o historii bieżeńców nie wspominały podręczniki, nie mówiono o niej w szkole, regionalnych muzeach, w całej przestrzeni publicznej. Opowiadano w rodzinach. Zdania te napisała Aneta Prymaka-Oniszk, prowadząca internetową stronę biezenstwo.pl, która razem z Ewą Moroz-Keczyńską, kustoszem Muzeum Białowieskiego Parku Narodowego przygotowywała wystawę. Każda tablica wprowadza nas w tamtą odległą rzeczywistość. Czyni to jednocześnie w racjonalny, uporządkowany sposób – podając fakty historyczne, źródła, relacje – ale i zarazem pobudzając emocje i wrażliwość oglądającego. To nie tylko urok archiwalnych, stuletnich fotografii oddziałuje na nas, ale przede wszystkim prostota, jasność i bezpośredniość przekazu utrwalonego przed laty obrazu, wzmocnionego bardzo sugestywnymi i trafionymi tekstami. Jedna z tablic ma tytuł: *Niech bieżeńcy nie proszą o drewno na trumny*, a obok niego widzimy zdjęcie z pogrzebu dziecka. Mała trumienka, białe koronki i leżąca w niej drobna postać. Nad nią smutne twarze kobiet. Z około trzech milionów bieżeńców jedna trzecia nie wróciła. Umierali dorośli i dzieci. Milion

grobów pozostało w dalekiej Rosji. *Trójkę starszych pochowałam w drodze, tylko ona mi została*… To inny, kolejny tytuł.

Jak oni dali radę, nie mam pojęcia… To chyba najbardziej rzucające się w oczy zdjęcie tej wystawy. Dwójka dzieci, okutanych w ubrania, jakieś szmaty. Smutne oczy dziewczynki może siedmio-, ośmioletniej i chłopca w kufajce (kaftanie?) o zbyt długich rękawach. Patrząc na dzieci znajdujące się w trudnych, dramatycznych okolicznościach, w dwójnasób przeżywamy ten widok. Myślimy o naszych dzieciach albo o sobie, gdy dziećmi byliśmy. Wzruszamy się.

Zanim wszyscy weszli do muzeum, na zewnątrz w podcieniach, oglądali ekspozycję „Bieżeństwo (uchodźstwo) 1915. Wspólna historia", przygotowaną przez Fundację Księcia Konstantego Ostrogskiego. Wystawa została skomponowana z archiwalnych zdjęć i dokumentów pochodzących z lat 1909-1923. Pokazuje, objaśnia, edukuje. I podróżuje: Białystok – Bielsk – Białowieża... Po to, aby jak najwięcej osób dowiedziało się o tym zapomnianym fragmencie naszej historii.

Sala konferencyjna Muzeum BPN z trudem mieściła wszystkich zainteresowanych. Zarówno wykłady, projekcja filmu, jak i spektakl, które przygotowano oprócz wystaw, cieszyły się niesłabnącym zainteresowaniem publiczności, która w Noc Muzeów tłumnie odwiedziła białowieską placówkę. Podczas wykładu Doroteusza Fionika przysiadłem na schodkach, bo nie było już wolnych foteli. Wcześniej podobnie było podczas wystąpień Anety Prymaka-Oniszk i wykładu przygotowanego przez dr. Andrzeja Nieuważnego z Uniwersytetu Mikołaja Kopernika w Toruniu. Odnosiło się wrażenie, że im więcej o bieżeństwie pokazywano i mówiono, tym większe budziło ono zainteresowanie.

Film

Jerzy Kalina swój film „Bieżeńcy" realizował w 1999 roku, gdy jeszcze można było porozmawiać z żyjącymi świadkami tamtych wydarzeń sprzed stu lat.

Likieria Żuk, rocznik 1905. *Taszkient. Najpierw byliśmy w Taszkiencie. Ale tam było niedobre powietrze, tam nasi ludzie umierali. Codziennie słychać było płacz*…

Arseniusz Łuszcz, rocznik 1912. *Moja matka zajechała do Rostowa. Z naszej wsi Koszele było tam dużo ludzi.*

Nikita Kaczan, rocznik 1912. *Te kacapy to bardzo dobroduszni ludzie. Witali nas: bieżeńcy, bieżeńcy… Dawali nam chleb, mąkę, bo sami mieli tego pod dostatkiem. Tam była bardzo dobra ziemia.*

(…) *Na Syberii nie było głodu. Dobrze tam żyliśmy. Ziemia była urodzajna. Najgorzej, że zima była bardzo długa.*

Luba Bondaruk, rocznik 1912. *Tam ludzie byli przyjaźni. Dbali o człowieka, o nas*…

Oni przeżyli bieżeństwo. Zanim jeszcze dorośli. Doświadczyli tego obcego, niezrozumiałego świata, byli świadkami okrutnej, dzikiej przemocy czasu rewolucji i wojny domowej w Rosji. Pamiętam, jak moja babcia Dominika (rocznik 1909) opowiadała z zachwytem o bazarze w Omsku, o workach wypełnionych orzeszkami… Raj dla dzieci. A jak wybuchła rewolucja – wszystko zniknęło. Jej ojca bolszewicy o mało nie zabili. Prośby i krzyki jego żony: *My czornoraboczyje, my czornoraboczyje*! zdaje się powstrzymały egzekucję, a może przypadkowo rewolucjoniści nie byli za mocno pijani albo – kto wie? – może byli zbyt pijani… I tak mój pradziadek przeżył. I wrócili wszyscy do Moszczony. Do czego wrócili? Do ruin, trawy i zielska po pas, samosiejek zarastających pola.

Spektakl

Grupa Teatralna z Muzeum Białoruskiego w Hajnówce przygotowała spektakl „Bieżeńcy". Powstał on, jak powiedziała jego reżyserka i artystyczna opiekunka, Joanna Troc, na podstawie opowiadania Bożeny Demjaniuk, tekstu o. Grzegorza Misijuka oraz wpisów na portalu biezenstwo.pl. Czwórka hajnowskich licealistów – dwie dziewczyny i dwóch chłopaków – wcielili się w role mieszkańców białoruskiej wsi, których losem pokierowała wojna i bieżeństwo. W półgodzinnym spektaklu, granym w białoruskim dialekcie z okolic Hajnówki, mamy okazję przejść drogę, którą musieli podążać nasi przodkowie. Wojna, ucieczka, rewolucja, (niepewny) powrót do kraju, na ojcowiznę. Przedstawienie oparte na klasycznej formie okazało się bardzo trafione



Fot. Janusz Korbel

Otwarcie wystawy

w swej prostocie, zrozumiałe i wzruszające. Potwierdziła to publiczność, która długo oklaskiwała młodych aktorów-amatorów i panią reżyser.

Bieżeństwo. Niezwykła historia zwykłych ludzi.

To opowieść o ludziach z podlaskiej wsi, wyrwanych ze swych domów i wysłanych na drugi koniec Imperium Rosyjskiego. Wrzuceni w wir wojny i późniejszej rewolucji, osamotnieni, nieprzygotowani. Jak sobie radzili? Co przeżyli? Wystawa w Białowieskim Parku Narodowym pozwala uczestnikom wydarzeń sprzed 100 lat opowiedzieć o swoich przeżyciach. [*To*]*doświadczenie tych zwykłych ludzi stoi w centrum zainteresowania. Mogą tu sami przemówić: poprzez teksty źródłowe – wspomnienia i relacje oraz unikalne zdjęcia czasu bieżeństwa. Zwiedzający może poczuć ich emocje, lepiej zrozumieć przeżycia.*

Nie było chyba do tej pory wydarzenia, które by w tak pełnej i urozmaiconej formie opowiadało o bieżeństwie, jak to, które w Noc Muzeów przygotowano w Białowieży. Bieżeńcy powrócili. I niech już zostaną.

Jerzy Sulżyk



Fot. Jerzy Sulżyk

Spektakl „Bieżeńcy"

„Bieżeństwo. Niezwykła historia zwykłych ludzi". Wystawa w Muzeum Białowieskiego Parku Narodowego, otwarta 16.05.2015

Ewa Moroz-Keczyńska, kuratorka wystawy (BPN) i Aneta Prymaka-Oniszk – autorka tekstów do wystawy (biezenstwo.pl)

Organizatorzy: Białowieski Park Narodowy oraz Nadleśnictwa Puszczy Białowieskiej: Białowieża, Browsk, Hajnówka, przy współpracy z portalem biezenstwo.pl


Cytaty pochodzą z tekstów umieszczonych na wystawie oraz ze strony internetowej biezenstwo.pl



Рэцензіі, прэзентацыі

Polesia ślad. Próba innego spojrzenia

Biorąc pod uwagę mizerię literatury dotyczącej Białorusi w naszym kraju, książka reporterska traktująca o białoruskim Polesiu nie może przejść niezauważona przez zainteresowanych tematem, szczególnie tych, którzy poszukują Polesia współczesnego, realnego, bardziej niż mitycznej krainy pełnej dworków szlacheckich i kresowych legend. Ci drudzy są w nieco lepszej sytuacji, bowiem historyczno-wspomnieniowych publikacji czy albumów dokumentujących polonika na wschodzie jest więcej, niż pozycji przybliżających Polesie pozbawionych kresowego filtra, co zapewne zgodne jest z zasadą popytu i podaży. Tym niemniej taka grupa także ist-



nieje i z tym większą niecierpliwością oczekuje na pozycje, które pozwolą przedrzeć się nie tylko przez dość szczelną i dla wielu noszącą znamiona „żelaznej" granicę, ale także przez nawarstwienia tak stereotypów i sentymentalnych opowieści o dawnych, świetlanych czasach dawnej Rzeczypospolitej, jak i postrzegania Białorusi przez pryzmat jej obecnej politycznej sytuacji. Tego arcytrudnego zadania podjęła się Małgorzata Szejnert, znakomita dziennikarka i utytułowana pisarka. Inspiracją do napisania książki o Polesiu była postać Ryszarda Kapuścińskiego, który wielokrotnie wspominał o planach napisania książki o jego ukochanym Pińsku – stolicy Polesia, w której urodził się i wychował, ale niestety napisać już nie zdążył. Ideą, która przyświecała autorce przy pisaniu tej książki, była próba przełamania polonocentrycznego spojrzenia na „dawne Kresy" i pokazanie Polesia takim, jakie ono jest w rzeczywistości. Pojęcie „Polesia czar" budzi we mnie bunt – oznajmia w jednym z wywiadów autorka, dając wyraz niechęci do sentymentalnego powielania schematów. Renoma autorki w połączeniu z tego typu deklaracjami dawały nadzieję na powstanie publikacji rzetelnej i spełniającej pokładane w niej oczekiwania.

Książka powstała po zaledwie trzykrotnym odwiedzeniu Polesia przez autorkę, tym niemniej pojechała ona doskonale przygotowana. Niedostatek materiału terenowego uzupełnia obszernym materiałem historycznym i wspomnieniowym. Głębokie studia materiałów polsko-, białorusko- i rosyjskojęzycznych widać w książce na każdym kroku – rzeczowa wiedza okraszona jest mnóstwem dat, ciekawostek i wydarzeń z przeszłości. Reporterka nie porusza się po omacku, nie jedzie gdzie oczy poniosą, nie rozmawia z przypadkowymi osobami. Starannie wybiera miejsca i rozmówców, konstruując opowieść o Polesiu według własnego klucza, a kluczem tym jest – historia. Autorka koncentruje się na zagadnieniach, które w jakikolwiek sposób już niegdyś zaistniały i zostały opisane w literaturze. Udaje się na Polesie z głową przepełnioną zasłyszanymi i przeczytanymi historiami, by móc skonfrontować swoje wyobrażenia z rzeczywistością. Jedzie do mitycznej krainy, by ujrzeć ją na początku XXI wieku i opisać, w jaki sposób zmieniły się miejscowości, dwory i społeczności, jak potoczyła się historia osób, o których miała okazję przeczytać. Wyrusza do Kudrycz śladami amerykańskiej podróżniczki Luis Arner Boyd, by na własne oczy zobaczyć osławioną zdjęciami „najbardziej zapadłą wieś Polesia", zagląda do zielonoświątkowców, by dowiedzieć się, jak ma się dzisiaj denominacja, której Obrębski wieszczył rychły upadek, snuje rozważania na temat „dobrych" i „złych" panów na kresowych majątkach, a nawet jeden rozdział poświęca legendarnym kołtunom, chociaż od dawna kołtuny istnieją jedynie na pożółkłych kartkach książek etnograficznych. Celem pisarki nie jest poznanie Polesia i Poleszuków jako takich. Skupia się ona raczej na szukaniu śladów Polesia dawnego, by móc dopowiedzieć dalszą część historii. Na kartach książki więcej znajdziemy historycznych materiałów i opowieści o przeszłości, niż o współczesnym Polesiu. Momentami na się wrażenie, że czyta się bardziej książkę historyczną niż reporterską, przez co podtytuł „Historie z Polesia" wydaje się jak najbardziej adekwatny.

Książka jest zbiorem obrazków i szkiców silnie osadzonych w przeszłości, spoza których wyziera momentami Polesie współczesne, ale raczej jako dopełnienie niż cel sam w sobie. Autorka wiele uwagi poświęca problemowi kultywowania pamięci o dziedzictwie wielokulturowych Kresów. Odwiedza muzea, miejsca pamięci, spotyka się z osobami, którym zależy, bądź powinno zależeć na zachowaniu pamięci o przeszłości racji wykonywanego zawodu bądź stanowiska. Efekty tych spotkań są różne, czasami bardzo zaskakujące, jak w przypadku spotkania z weteranami osławionej flotylli pińskiej, by w trakcie rozmowy uświadomić sobie, że „flotylla pińska" dla Polaka i Białorusina oznacza zupełnie co innego! Ten moment, w którym autorka zupełnie przypadkiem i jakby niechcący odkrywa dwa światy równolegle, spotyka się z odmienną mentalnością, zupełnie różnym od polskiego punktem widzenia, jest doświadczeniem szczególnie cennym. Spotkania z ludźmi, dzięki którym poznaje białoruską rzeczywistość są istotnym atutem opowieści. Nie można autorce odmówić uczciwości – odmalowuje bowiem zastany świat takim, jakim jest, w różnokolorowych barwach, z jednakową atencją traktując elementy jasne, i te nieco mniej świetlane.

Książka Małgorzaty Szejnert to starannie zaprojektowana, rozłożona na akty opowieść o Polesiu dawnym i współczesnym, pogłębiona refleksją zawierającą puentę nieoczywistą, niedosłowną i daleką od ferowania jednoznacznych wyroków. Reporterka stara się relacjonować wydarzenia z pozycji bezstronnego obserwatora, skrupulatnego kronikarza skupionego bardziej na opisywaniu faktów niż na podawaniu gotowych formułek i ocen. Niewątpliwym walorem publikacji jest język – precyzyjny, zdyscyplinowany a jednocześnie obrazowy i sugestywny literacko, co czyni z książki łakomy kąsek dla konese-

rów dobrego pisarstwa. Książka jest świetną pozycją dla rozkochanych w Kresach pasjonatów historii, pragnących pogłębić obraz mitycznej krainy o bardziej współczesne akcenty. Autorskie podsumowanie nakreślonego obrazu jako „próby przełamania polonocentrycznego punktu widzenia" moim zdaniem świetnie definiuje efekt końcowy. Jest to próba podjęta na gruncie polskiej literatury po raz pierwszy, co bez wątpienia przydaje jej heroiczności i bezwzględnie zasługuje na docenienie, ale pozostaje próbą, która powiodła się – w mojej ocenie – jedynie połowicznie.

Ewa Zwierzyńska

Małgorzata Szejnert „Usypać góry. Historie z Polesia", Wydawnictwo Znak, Kraków 2015.

Міхась Шаховіч

Надзея

Змярканне фіялетам разлівалася над зямлёю. Сцябаў вецер. Кідаўся то туды, то сюды, быццам бы ў абароне сонца рэштаю сіл стараўся развеяць упэўнена наступаючую ноч. Неба крывавіла. Па шыбіне прашальна прабег апошні прамень канаючага сонца і ўсё заціхла. Нешта таілася. Прытоена чакала...

Зграбныя стрэлкі гадзінніка тупалі па цыферблаце, заманліва адлічваючы час. Ён знаў смак чакання. Чаканне-азарт. Чым даўжэй чакаеш, тым чакаць хочацца. Аж нябачна знойдзешся ў бязвыхаднасці. Як у рулетцы: надзея і абрыў. Раней ці пазней, але ж наступіць. І толькі бязлітасныя ўспаміны, якія то б'юць, то ратуюць, але таксама балюча. Цярпі, моў, пакутуй – можа, апамятаешся. Нясцерпны боль. І тут ён пазайздросціў тым, якім ладкуецца. Яны ўспамінаў не маюць. Адганяюць іх як старэнькую маці, якая не пасуе да панскага асяроддзя. Яны забілі сваю біяграфію і хціва прыбліжаюць час, усё роўна, што толькі ім ён належыць. І так паўзуць па гарызонце часу. А ў пагаворцы: „Певень жыве коратка, ды весела".

– Не! – спахапіўся. – Лепш не жыць зусім, чым жыць без свайго ценю.

З надзеяй глянуў у акно. Чорныя лапіны дрэў замяшалі зорнае неба, быццам бы хацелі вычысціць яго да ідэальнай празрыстасці. Рыхтавалі дарогу месяцу. Новыя ўладары навыклі паганяць ад пачатку. І так наўкол, як у манежы.

Здалося, быццам бы нешта стукнула. Ён надзейна кінуўся да акна, але навыклыя да святла вочы напаткалі толькі сцяну цемры. Разганяў яе шырынёй зрэнак – узіраўся, але толькі месяц жартоўна пасмейваўся. Вярнуўся. У думку стукалі ўспаміны, дабіваліся. Тупа ўзіраўся ў агонь, што патрэскваў у камінку. Адчуваў яго блізкасць, быццам бы да яго далоні ківаў: „Хадзі сюды, хадзі". І ўсё закружылася, адышоў ад агню ў нейкім трансе, каб перажыць яшчэ раз тое... Тое, самае прыгожае ў сваім жыцці, што дало пачатак, паказала дарогу. Дало і пажартавала. Маеце, моў, шчасце, але вы і так шчасцем цешыцца не ўмееце. І каб усіліць боль, яшчэ раз і яшчэ прыпомнілася тое...

Адвячорак гасцяваў на зямлі. Смольны пах ішоў ад



Фота Пятра Нестэровіча

лесу. З усходняй услужлівасцю вітаў ён іх на парозе свайго замчышча. Спыніліся і слухалі, трымаючыся за рукі. Як дзеці. Жартавалі. Зелень маніла ў сваё зачараванае каралеўства. На высокім небе вітальна адна за адной запальваліся зоркі. Лес спяваў, памуркваў і прыманьваў араматнай пасцеллю. Пузаты месяц, адпіхнуўшыся ад верхавін дрэў, выплыў на поўнае неба і разлівіста заўсміхаўся. Спакусіў... Лясная паляна расчынілася перад імі сваім дзявоцтвам. Наўкол засланялі іх гонкія елкі – цёмна-таямнічыя спадыспаду, серабрыстыя на вярхах. І ціш, тая ціш, што чуваць, як плыве па венах твая ўласная кроў. Здавалася, што не толькі наваколле, але і свет спыніў сваё дыханне. Нічога-нічагуткі, адно толькі той кавалачак зямлі пасярод лесу, што іх прытуліў і зорнае неба над імі. Прыселі. Пачынала віднець...

Здалося, нехта азваўся. Ён з болем парваў ніць успамінаў і кінуўся да акна. Цемра. Гэта толькі цвыркун, што дзесьці за камінком знайшоў сабе прытулак. Манатонна праскрыпеў на сваёй скрыпачцы... Прыпомніліся словы маці: „Шчаслівая тая хата, дзе цвыркун пасяліцца". Колькі ж такіх цвыркуноў ён чуў у сваім жыцці, а шчасце як маўчала, так маўчыць!

Падкінуў калодаў у гаснучы камінок. Затрашчалі смалістыя палены. Любіў гэты трэск і той цудоўны незабыўны пах, які нагадваў яму час дзяцінства. Тыя шчасныя хвіліны, калі бацька ў рэдкія моманты прысутнасці садавіў яго побач, ускудлачваў чорную чупрыну сына і

баяў. Сёння ўжо і бацькі няма, а казкі разбаяліся. Адно агонь астаўся. Нібы не той, але так жа свеціць і грэе. Гарыць як каханне, але хопіць, што прыгасне – холадна робіцца і цёмна. Гарэў бы...

– Ты бачыш, – як рэха мінулага даляцелі словы сябра Ваські. Той да ўсяго падыходзіў з мужыцкай развагай і хітрасцю. Ніхто не мог парушыць яго практычнага падыходу да жыцця. Памёр ужо Васька, на жаль. – Жанчына не выбірае прафесіі мужа, але мужа. І то не заўсёды. Адна і тая ж жанчына можа быць жонкай лекара ў нейкім закутку, віртуоза фартэпіяна – і ездзіць па ўсім свеце. Можа быць жонкай хіміка і жыць пры нейкай там цукроўні, або жонкай пісьменніка і цікавіцца літаратурай. Мужчына ж да жонкі не ўмее дастасавацца. Хіба, што адурэе. Жанчына будзе жыць там, дзе мусіць жыць яе муж...

– Яно мо то і праўда, – зашаптаў, каб не спалохаць цішы. – Але жанчына думае па-жаноцку. Прытым пераканаўча, упэўнена...

Памятаў, добра памятаў, як за імянінным сталом, падбадзёрыўшыся чорнаю каваю, Надзя правакавала: „Няма на цэлым свеце такой жанчыны, якая б адбіла мне мужа!”

А такога не павінна гаварыць ніводная жонка, тым больш у прысутнасці маладзейшай ад сябе прыгажуні. Так стараўся апраўдваць свой развод з Надзяй. Пачалося ўсё жартам, а кончылася ў рэчаіснасці.

Узіраўся ў патрэскваючы агонь і здавалася яму, што выходзіць з яго Надзя з вясёлай усмешкаю. Бяжыць да яго на спатканне. Ужо працягваў да яе рукі, калі апамятаўся...

Самота – найгоршая катоўня. Нясраз хацелася выбегчы ў ноч з сёмага паверха, але нешта трымала і крычала: Пакутуй! А можа сам сябе паўстрымоўваў. Смерць развязвае ўсё тое, чаго жыццё развязаць не можа. А ўсё ж такі паміраць не хочацца. Нават тады, калі б, здавалася, усё закончана. Нават тады дзесьці ў глыбі тліцца надзея на новае. Кінь успаміны.... На спатканне з Богам ніхто яшчэ не спазніўся!..

– Пачакай, – нешта шаптала яму, – калі сказана, што прыйдзе, то прыйдзе.

За акном выразна чутна было крокі.

Міхась Шаховіч памёр 15 гадоў таму, 5 чэрвеня 2000 г., нечакана зыйшоўшы са свету ва ўзросце ўсяго 47 гадоў. Быў аўтарам некалькіх зборнікаў паэзіі, працаваў у „Ніве”, „Кантрастах”, супрацоўнічаў таксама з „Часопісам”.

Сакрат Яновіч

Акно

Як толькі перастаў я поўзаць малечаю па хаце і пачаў хадзіць, памятаю акно. Яно вабіла мяне святлом і таемнымі гукамі. Даставаўся я да яго з бядою, але неадступна. Ужо прадчуваў і нават разумеў, што свет не канчаецца ў сенях, і аднекуль заходзяць да нас людзі, цёткі з дарункамі цукеркаў. Мне вельмі хацелася ўбачыць – менавіта – адкуль яны і як; а яшчэ, якія ў іх хаты, бо чуў, што таксама маюць свае...

Акно снілася. Тады я вылятаў цераз яго бабульчыным анёлам і зачаравана прынюхваўся месяцавай бондзе з пахамі велікоднага пірага. Зоркі, калі спрабоўваў лізнуць каторую, прынаджвалі смакам ландрынак. Не баяўся вышыні, не ведаючы, што такая ёсць.

Прачнуўшыся, жальна плакаў. Пакуль прыйшла вясна і мацерка вывела мяне на сонца.

На падворышчы я разгубіўся, бы зайчаня, што адбеглася ад гнязда пад мяжою ў шырокае поле. Першае, што ўгледзеў быў з пярэпалаху – гэта куры з пеўнем і парасяты, што смачна прысмакталіся адно каля аднаго да цыцак рохкаючай мацёры. Моцна здзіўлены, я не спадзяваўся, каб намаляваныя ў дзіцячай кніжцы тыя стварэнні напраўду жылі! Пасля дзівіўся што ні дзень усё чымсьці іншым, урэшце пажарам стадолаў ад грымотнага гневу Бозі.

У травень з чэрвенем ды ў ліпень са жніўнем, гуляючы не выходзіў з сенакоснае аселіцы з капуснымі загонамі, над якімі мільгацелі бялюсенькія матылі. Азіраўся на нашу хатку з рассмяяным акном, рагатліва расчыненым, і ветрык навейваў адтуль попахі смажаных скварак з цыбуляю... Тлусты арамат у перадабедак, калі вядома, што вось дакіпае рассыпістая бульба і ўжо адстаўлена з агню пад фаеркамі пліты гарачая страва з маладзістага шчаўю і з скабкаю свінога мяса. Ад прыступу першабытнага голаду, які магчымы толькі ў таго, хто расце і дужэе, гнаўся з архетыпным крыкам: „Мама, я хачу есці!”

Мой малы генезіс

У дваццатым стагоддзі аднойчы жыць давялося. У самых пачатках славянскага ўсходу, у Крынках. У азіяцкія аднак тут зімы, хоць лета час-часом залятае сюды ад Элады. Мікраполісны гімназіён у нас тады – памятаецца – размяшчаўся ў драўляным асабняку колішняга медыка іудзейскага (забілі яго былі рыжыя германе). У юнацтва маё ўрокі ў ім давалі варвары, падвучаныя з мясцовых багатыроў. Яны, праўда, чулі нават пра Сакрата ды ягонага вучня Платона, але ўсё ж шчыра не спадзяваліся, што як хрысціяне пакланяюцца жыду Ісусу...

У той – пасля вялікае вайны акурат – росквіт прымітыўнае цывілізацыі ў тутэйшым старонні надарылася немалая ўдача халопам і плебеям. Ім, зрэшты, заўсёды даволі шчасця з хлеба, віна, пропаведзі; у такім клі-

маце яшчэ і з жытла. Горадзец іх – Беласток, у нечым кшталтам Афінаў з графаманскім падабенствам Акрапалю, у выглядзе чырвонасцяжнае будыніны на валасную меру. Прышываныя дочкі бульбаносыя Карынфа аблюбавалі венерную Кракаўскую вуліцу (па-кашэчаму ўтульную).

Жывецца, вось, бы запацеламу Сізіфу пад гарою.

Вельмі практычна прытым не бярэм у галаву выпадковасць свайго ў кожнага з'яўлення на свет. І таго, таксама, што нараджаемся, каб памерці. Намагаемся затое на сэнс уласнага існавання – хто паўжыцця на куплю аўтамашыны аддае, іншы на бабы растрачваецца; бывае, на гарэлку ўсянютка прасадзіць або ў саладосць скандалаў кінецца; камусьці горб вырасце ад службы вернае... Тлумачыцца тое і тое, і дзесятае, папулярным махлярствам, дбайнасцю менавіта пра ясную долю дзецям родным. А яны ж, наследкі тыя, толькі ў плямёнаў першабытных паўтараюць бацькаў лёс, аб чым ужо ведалі ў белакаменную старажытнасць.

Можна сказаць: і славяне прыдумалі душу... Няпраўда, аднак жа, што і пекла з раем. Няма пэўнасці, дарэчы, ці гэта вынаходніцтва якраз эмацыянальных элінаў у суправажжы з рацыянальнымі рымлянамі. Разам з тым досыць камічна гаварыць пра бяссмерце выпадковага. Нашто чалавеку вечнасць? Каб швэндацца неўміручым турыстам пасля зямное натруджанасці?

Бунтарны Ізраіль, пляжаны кесарамі, паспеў ашчасліваць нас Богам Адзіным. Сын Яго – будзе дзве тысячы гадоў ад банальнага ў тую пару распяцця – надарэмна вучыць дурняў розуму, варагоў прыяцельству, багатых спагаднасці. Але, прынамсі, Богаайца баімся па паганскай традыцыі, замест хрысціянскай любові ўсімі ўсіх. Таму перспектыва раю звузілася ва утопію, а вароты ў пекла нядбайна расчыненыя.

З дзіцячай упартасцю вяртаецца пытанне: а нашто ўсё гэта? Жыццё на зямлі дзеля неба? Зямное ў імя незямнога? Такіх сумненняў не наглядаецца ў галодных і халодных. У гэтым, відаць, і адказ. Адназначны, бы арганізм. І кпіна лірыкі смерці, усё роўна што папрок паэтам ды фанатыкам.

Аднаму Богу вядомая сутнасць свету, з чым я гатоў пагадзіцца. Бо ставіць пад пытанне Сусвет гэтак жа бяссэнсава, як і свае нарадзіны.

Рэмінісцэнцыі

Табе пад пяцьдзесят. Ты: дабіўся для сябе невытлумачальна больш, чымсьці магло прысніцца табе, вырастаючаму на падпанка ў гады свае далёкія, калі для ўсіх тады пачынаўся гэты новы свет, і вось завяршаецца наша стагоддзе, пра якое некалі запытаюць: а чаму яно было такое – і ваеннае і дабрабытнае?

...На Багача слівы пасмуглелі. На іх папырскаў быў дожджык і яны выглядалі незвычайна сакаўнымі. І ад таго яшчэ, можа быць, што дзень жа святочны і пры гэтым ціхі ўпалудзень ды барвовы на зыходзе; парумяненая лістота, пахацяць выспелыя агароды.

Ад самюткага рання суседка спраўляла хрэсьбіны. На траве каля ганка яе, па-прыгараднаму вымаджанага дома паразлягаліся напоеныя мужчыны (храплі – у белых кашулях і ў чорных касцюмах, ад якіх яны трохі, як пінгвіны якія). З расчыненых вокан, што на паверсе, з-за далікацтва фіранак у іх далятала сварня ў застоллі, звяглівая і нясціхная (так, калі застануцца за чаркамі адны бабы). Таму вельмі дарэчы было пайсці адсюль у малінавы закутак і прысесці там сабе на камяні, выгратым сонцам. У настрої, які не параўнаць з адпачынкам ратая або з існаваннем толькі, такім безпачуццёвым. Відаць поле, як прасціраецца яно ад запушчанага парку, маянтковага. Яго прыгажосць бачыш ты ў раптоўным цудзе песні ці ў малітве верша, – панскімі вачыма культуры, памятай. Не-е трасучы гной, і не за плугам...

Засланяючы нанач спальны пакой, угледзіш месяц. Заўважыўшы яго фазу, табе падумаецца, што час праміная ў нейкім чаканні, аднак жа, бяжыць ён, быццам па-зайчынаму вяртаючыся ў тое ж месца і ўсё роўна што выгледжваючы вочы за кімсьці. Ці дзіва, чаму тваё жыццё не зусім каб патрэбнае, здасца яно табе да крыўднасці выпадковым, хоць і не хапае дзеля яго дня ды з вечарам...

У летняе ўставанне, у той перадспякотны халадок бярэ ахвота папрацаваць – з радасным жаданнем быць прысутным у жывым, зялёным і светлым. У балаціне, што пад Лісіным Грудам, крычыць тамашняя птушка. Ты ўспомніш аднакласніка з паўзабытай вялікагарадской школы; ён, зарабіўшы мільёны, памёр ад рака.

Цябе гняце прымус закончыць сваё незакончанае, бо яно далося, хаця і ў звычнай табе хамутнай натузе, праз плойму гадоў шэра-шэрых, і ты баішся, каб не апусціць залішне рук. Гэткі спех – твая змора і дакучнасць. Уласцівасць безвыходнага.

У замглёнасці ўзлессе ў бок Пачапка пасецца дзікі звер. Відацьме алень. Чаму ён якраз навідавоку? Гэта ж так небяспечна для яго, апынуцца ў полі зроку чалавека!..

Эх, аўтамашынай паімчацца б табе па шашы ў майскім дрэўі! Панаднейшы смак ад таго, калі ты далей, у глыбі мураванай Польшчы, альбо ў па-заходняму акуратным замежжы. У бацькоўскім жа старонні дагніваюць пакінутыя вёскі, якімі, а каб не, зацікавяцца археолагі зацюканасці ды бядоты. Куды прападае людская праца? – палі зарастаюць хмызам, украпівелыя сядзібы нагадваюць сабою колішнія могілкі з руінаю капліцы, а ўнукам нашым манерным і не ў здогад нават тое, што ёсць ў іх дзяды ды прадзеды... Народ мой хворы бяспамяццю таксама.

Яблык падае блізка ад яблыні. Гэта так, як лёс маці паўтараецца ў дачцэ, праўда, па-свойму... Хвалімся, га-

лытва ўчарашняя, вялізным кавалкам хлеба, нарэшце і катэджамі з мансардамі, каб папанстваваць, не цямячы чамусьці, што знакі багацця сталі не тыя і што ўсё гэтак жа міражныя яны для нас. Мінулае нацыі, бы абсалютная ісціна або прыцягненне зямное, што моцна трымае нас, – помсліва ці як, не дае нам выпраставацца, пазбыцца анамаліі росту.

У Крынскай пушчы ўпаткацьмеш паляны з вывараценямі і лугі, ад хараства якіх затрымціць табе ўваччу. Адзін лес старасць упрыгожвае, і ён веквечны. Будзе мець рацыю той, хто прыраўняе да яго культуру (без яе свет сам не ведаў бы пра сябе, пра тое, што ён быў і ёсць!). Сядзеш, каб ногі табе адышлі, збоч ад сенакоснай траскоты касілак і на строме рэчкі ў лозах, над тою яе затокаю, у якой вудзяць маладых шчупакоў. Вада бруіцца ў ёй у водарасцях, а цябе пранізвае заедліва: ну чаму гэта мы, чаму забедныя і забедныя?! Дападаем да сваіх шанцаў, а яны, аказваецца, высмактаныя... Ачышчаючы з галчыных гнёздаў комін і апухі, ты дзівіўся, што знаходзіў у іх засушаны трупок пісклянёці, як заўсёды адно заморанае.

Еўропа нам даўно за гарамі. Нічога не скажаш, не мужыку ж палацы ў галаве (прынята гаварыць у высокім тоне). А па шчырасці, дык куды прасцей усенька ў нас адбываецца – а будзь ты сабе кім хочаш, абы грашавітым! Нішто ёсць усё золата і блакіт дня, тамы кнігаў



Фота Януша Корбеля

ды старцаў развагі, сама існасць існасці, – хлісні долі нашай над нашымі, мазаля яе і ганьбы пакаштуй. Вымавіш тады: разумею, – і аціхнеш утомна, без болю (бо ён у таго толькі, хто не пагаджаецца).

Племя маё нагамі дапераду выносяць унукі ягоныя, тыя ж пачужэлыя, і пажыткамі дзеляцца. А мо і застанецца пасля яго ўсяго сытасць бяздумная, якой будзе выгода параю? Калі так, дык пажартавала з нас асвячоная эпоха ўсеўладная, быццам ласкавая пані яснавяльможная калісьці, што служкаў сваіх віншавала імянінна ды за стол свой запрасіла, а мы так жа цяпер наеліся за ім ажно да адрыжкі, усё роўна што за ўсе вякі мінулыя, а як жа глумныя над намі!.. ■

Для дзяцей

Гісторыя Кукі

Першым, што пабачыла птушанятка, было зялёнае, аблітае летнім сонца лісце. Малеча зацікаўлена высунула дзюбку са шкарлупінкі яйка, заміргала жоўтымі вочкамі і энергічна раздзяўбла шкарлупінку да канца.

Сонечныя прамяні ў адзін момант высушылі рэдкі пух птушаняці, якое неўзабаве пачало рухаць маленькімі, аголенымі крыльцамі, нязграбна іх раскідваючы. Яно насалоджвалася павевамі цёплага паветра, якое ахінала далікатны пух. Тады птушанятка заўважыла, што ў гняздзе ўжо сядзелі тры іншыя істоты, якія да яго ўважліва прыглядаліся.

– Гэй! – азвалася адна з іх. – Ты хто?

Вылупленая толькі што малеча адвярнула галоўку, бо не магла адказаць на гэтае пытанне.

– Ты непадобная да нас, – сказала другое птушаня.

– Менавіта, – падтакнула трэцяе.

– Няхай вырашыць наша мама, – піскнулі яны ў адзін голас. – Яна якраз падлятае.

Мама пліска прысела на галіне ля гнязда, яе чорныя вочы заблішчэлі ад здзіўлення, як толькі яна пабачыла апошняе птушанё, якое ўрэшце вылупілася.

– Хто ты і адкуль з’явілася ў нашым гняздзе? – неспакойна зашчабятала пліска.

– Я не ведаю, – пахіліла галоўку птушанятка. – Я прачнулася ў маёй шкарлупінцы, пачала яе дзяўбці і яна трэснула. Потым я пачула шум лесу і спеў ветру. Гэта ўсё здарылася ў гэтым гняздзе, чаму тады гэта не мой дом?

– Хвілінку, – мама пліска збіралася з думкамі. – Няма сумневаў, ты і сапраўды птушанятка, але зусім не выглядаеш падобна да маіх дзяцей. Так як ты не належыш да сям’і, наш дом не можа быць тваім.

– Але ў мяне няма іншага, – сумна піскнула птушанятка. – А, можа я магу ў вас застацца? – спытала яно з надзеяй.

Пліска падумала, а пасля рашуча пакруціла галавою.

– Ты вырасцеш хутчэй за маіх дзяцей, я гэта ўжо цяпер бачу. Гняздо не змесціць вас усіх, таму вы будзеце піхацца, пакуль мае бедненькія дзеткі не выпадуць. Я не магу да гэтага дапусціць. Ідзі сабе адсюль!

У маленькага чужынца ў гняздзе плісак пацяклі слёзы з вачэй. Усхліпваючы, птушанё нязграбна выбралася з гнязда, пасунулася ўздоўж галінкі і скочыла на ніжэйшы сук. Не пацэліла! Птушачка ў роспачы замахала крыльцамі, але ж яна яшчэ не ўмела лятаць! Падаючы, яна апынулася пасярод высокае травы і там, урэшце, вярнула раўнавагу. Адважна вандруючы на-

перад, яна дайшла да землянога капца і пачала на яго караскацца.

– Гэй там! – перапалохаў яе сярдзіты голас. – Што гэта за манеры?

Здавалася, што голас гучаў з капца. І праўда, з яго вяршыні паказаўся спярша чорны носік, а пасля і пыска з заплюшчанымі вачыма.

– Хто…Ты хто такі? – спытала перапужаная птушачка, а яе крыльцы задрыжэлі.

– Як хто? Крот! – буркнула чорная істота, яшчэ больш высоўваючыся з капца, і пагражаючы птушаняці моцнай лапай. – Хуліган!

– Выбачайце, – жаласна заплакала малеча. – Я не хацела зрабіць нічога благога.

Аднак крот злосна працягваў:

– А калі б я патаптаў табе дом? Табе б такое спадабалася?

– Я не ведаю, – уздыхнула птушанё. – У мяне няма дому.

Плёткі старой цёткі

Ад гэтых выбараў-дурыбараў ужо ажно моташна, таму пра вялікую палітыку не будзем, а лепш апавяду пра дробную нашу палітыку-паралітыку.

Карацей, быў тут у нас такі адзін гусь прыезджы ў Грэдэлях – рэзідэнт-дачнік, захацеў стаць мясцовым радцам. Хто ж ім быць ня хоча – пайшоў на сходку, грывай паківаў, грошы забраў і качаўся як той сыр у масле. Ну, але пакольki ў Грэдэлях яго хутка раскусілі, а я асабіста разнесла ягоныя ахвёры па ўсім Бельску, то ў нашай гміне ён стартаваць не мог. Нехта яму параіў паспрабаваць у суседняй гміне Рудцы. Той гарадскі, значыцца, узяў, прабіў на сваім джыпіэсе назву вёскі і паехаў туды подпісы збіраць, каб пасля вылучацца. За адзін подпіс, кажуць, цэлую палку каўбасы і дзве пляшкі гарэлкі даваў. Ніводзін жыхар яму, вядома, не адмовіў, а і так сабралася нешта каля трыццаці подпісаў. Ну, думае, мікраскапічная нейкая гміна, таму ўзяў і на ўсякі выпадак аб’ехаў яшчэ некалькі навакольных вёсак. Пасьля задаволены вярнуўся, вылез з мерседэса і ў адной маёй тамашняй сяброўкі пытаецца: „Бабуся, дзе ў вас тут Рада гміны? Подпісы мушу здаць”. А тая будзе казаць: „У Гайнаўцы, паночку, у Гайнаўцы...”.

Ну, карацей, вы ўжо самі здагадаліся. Чалавек нетутэйшы, неабазнаны, гміну Рудку з вёскай Руткай, Гайнаўскага павету, паблытаў. Здавалася б, нічога такога, а на каўбасе і гарэлцы, можна сказаць, прагарэў. Пазней дачу прадаў, некуды з’ехаў і больш мы таго палітрука не бачылі.

Гэля з Грэдэляў

– Як гэта? – здзівіўся крот, які стаў цяпер больш ветлівым. – Чакай, чакай, гэта немагчыма! У кожнага ёсць нейкі дом.

Ён намагаўся распазнаць, што гэта за істота прытаілася пад яго капцом, але меў надта слабыя вочы. Можа гэта нейкі выключна малы гатунак крата?

– Я табе дапамагу, – сказаў ён са спачуваннем. — Ты можаш пасяліцца ў адным з маіх капцоў.

– У капцы? Яшчэ чаго! – над іх галовамі раздаўся піскливы голас з дрэва побач. – Гэта ж зязюля. І да таго, вельмі маленькая. Хто бачыў зязюлю, якая жыве разам з кратом? Дзе такое бачылі?

– Я кепска бачу, як я казаў, – тлумачыўся крот, – Але, прынамсі, я стараюся дапамагчы, спадарыня вавёрка. А што ты зробіш для гэтае малечы?

Вёрткая рудая жывёліна з пушыстым хвастом, спярша абабегла пень дрэва, а пасля пачала кружыцца вакол зязюлі.

– Дапамагчы? Рудзя таксама можа дапамагчы, – пранізліва піскнула вавёрка. – Я жыву ў дупле, там, высока, – яна паказала на дрэва. – Зязюлечка, ты можаш пасяліцца са мною, калі хочаш.

Вавёрка завяршыла свой танец і знерухомела ў чаканні перад птушаняткам, якое бездапаможна звесіла свае слабыя неапераныя крыльцы.

– З вялікай ахвотаю, але як я туды забяруся? Я ж не ўмею лятаць.

– Ах! Праўда? – пакруціла носам з недаверам вавёрка. – Дзе гэта чулі, каб зязюля не ўмела лятаць?

Цяпер ужо крот аказаўся больш растаропным.

– Дык ты ж сама казала, што гэта птушанё, – прамармытаў крот. – Яна проста яшчэ не навучылася лятаць, і да таго ж яна самотная. Мы павінны быць да яе ветлівымі і сардэчнымі.

– Мы можам быць ветлівымі, але гэта не дапаможа знайсці яе дом.

Рудзя спахапілася і маланкава абабегла вакол дрэва некалькі разоў, пасля чаго спынілася пад самым носам у крата.

– Тое, што мы мусім зрабіць для гэтае малечы перш за ўсё – гэта знайсці ёй дом.

Раптам яна выгукнула:

– Уцякаем! Уцякаем! Ідзе ляснік.

Невядома калі вавёрка знікла ў дупле. Крот таксама слізгануў у капец і зязюлька засталася адна. На ўсялякі выпадак яна замахала крыльцамі, але ў яе нічога не атрымалася – яна проста не магла лятаць. Перапужаная птушачка разглядалася з трывогай у пошуках нейкага схову… Чырвоны грыб з белымі кропкамі на капелюшы быў, на жаль, надта малым, каб пад ім схавацца. Не было таксама гусцейшых зараснікаў, і нават найбольш нізкая галіна звісала завысока, каб на яе магла ўскочыць маленькая зязюлька. Таму малеча прытулілася да спарахлелага пня і замерла ў чаканні. І ў самы час! Цяжкім

крокам падышоў ляснік, і быў ён не адзін. Разам з ім была дзяўчынка ў чырвоных чаравічках.

– Дзядуля, дзядуля, тут сядзіць птушачка! – дзяўчынка ўзрушана паклікала дзядулю і паказала на здранцвелую ад перапуду істоту.

Ляснік асцярожна падняў птушанё і паглядзеў уверх, у кроны дрэваў. Аднак, выглядала на тое, што не было ніякага гнязда. Не чуваць было і птушынага крыку. Ляснік сказаў дзяўчынцы:

– Бачыш, унучка, – патлумачыў ён, – гэта бяздомная зязюлька. Ані мама, ані тата не паклапоцяцца пра яе. У зязюляў так ёсць, яны падкідваюць свае яйкі іншым птушкам. Нейкая птушыная маці яе выседзела, а пасля выкінула з гнязда. Цяпер гэтае малое не мае шанцаў каб выжыць.

– Мы ж можам яе забраць у лесніčоўку, – запрапанавала дзяўчынка. – Я паклапачуся пра яе. Накармлю, напаю і абагрэю.

– Гэта вялікая адказнасць, любая мая, – сур'ёзна адказаў дзядуля. – Ты ўпэўненая, што хочаш дапамагчы гэтай маленькай зязюльцы?

– Так. Так, хачу! – крыкнула дзяўчынка. – Яна такая бедная і самотная.

– Што ж, паспрабуй, – вырашыў ляснік. – Выхаваць гэтую малечу так, каб яна навучылася лятаць і самастойна жыць, не будзе лёгка.


“Вазьмі мяне! Вазьмі мяне з сабою!” – прасіла зязюлянё ў думках. – “Я ўсё зраблю, каб выжыць, бо я хачу слухаць шэлест лісця, адчуваць подых ветру і лятаць… лятаць…”. І так сталася. Дзяўчынка асцярожна агарнула птушанё анучкай і панесла ў лесніčоўку.

– Ты ўжо ведаеш, як яе назавеш? – пачула зязюлянё голас лесніка.

– Вядома, што так, – адказала шчаслівая дзяўчынка. – Калі гэта зязюлька, і яна кукае, дык ясна, што яе трэба назваць “Кукі”.

Кандрат Кусьмірак

Аляксей Харкевіч – яшчэ раз успомнім...



6 мая 2015 года адышоў ад нас Аляксей Харкевіч. Пражыў ён даволі доўгае (82 гады) жыццё. І пражыў яго працавіта і бесканфліктна. Ён любіў жыццё і людзей – і яго людзі любілі. Жыў ён у Гайнаўцы, а паходзіў з вёскі Лешукі, з якой ніколі не парываў актыўнай сувязі. І там, каля сваіх бацькоў, выбраў сабе месца вечнага спачынку.

Па прафесіі Аляксей быў настаўнікам і гарцэрам. Любіў ён гэтыя прафесіі і любіў дзяцей і моладзь, і вельмі лёгка наладжваў кантакты з імі. Дзяцей сваіх Аляксей не меў, але сваіх хросных меў многа. Ён хрысціў, вучыў, выхоўваў, вянчаў і адпяваў. Усё гэта Аляксей умеў рабіць і рабіў, бо яго прасілі. Рабіў гэта коштам свайго вольнага часу і часам нават коштам свайго здароўя. Такім ён быў чалавекам. Быў добрым і вясёлым чалавекам, добрым беларусам і хрысціянінам.

Да канца дзён сваіх быў вельмі актыўным членам гайнаўскага беларускага хору і царкоўнага хору.

Вельмі многа свайго часу і фізічнай працы прысвяціў Харкевіч пабудове і арганізацыі Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Гэта ў асноўным ён ачышчаў пляц пад будову музея, сабіраў грошы на музей, выгружаў будаўнічыя матэрыялы і выконваў мноства іншых прац пры пабудове музея. Потым рэгулярна наведваў і дапамагаў пры арганізацыі розных музейных мерапрыемстваў. Рэгулярна выбіраўся таксама Аляксей Харкевіч ва ўлады Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Вечная яму памяць і няхай родная зямелька будзе яму пухам!

Васіль Сакоўскі

Спадар Аляксей Харкевіч быў моцна звязаны з нашым Беларускім Музеем і зразумела з тымі, хто працаваў у ім. Супольна з Кастусём Майсеняй і іншымі дзеячамі клапаціўся аб усім, што было звязанае з заснаваннем і пабудавай нашага Музея. Амаль кожны дзень, апоўдні, можна было пачуць яго голас і пытанне „Што чуваць, як жывеце?”. Да апошніх сваіх дзён прыходзіў, пытаў, дапамагаў. Праўда, два дні перад смерцю, не змог ужо да нас зайсці. Аб смерці нашага дарагога спадара Алёшы мы даведаліся ў сераду, раніцай. Гэтую сумную вестку перадаў нам журналіст Радыё Беласток Марэк Заброцкі. Калі я гэта пачула, сказала, што гэта, напэўна, памылка. Немагчыма, каб такі жыццярадасны і адданы беларускасці чалавек памёр! Аднак прыйшлося нам развітацца з Аляксеем Харкевічам.

Мінула тры тыдні, як спадар Харкевіч не зайшоў да нас, не запытаўся, што чуваць. Усё ж такі здаецца яшчэ, што недзе у поўдзень, пачуем стуканне ў дзверы і яго вясёлы голас...

Светлая памяць яшчэ доўга будзе жыць у сэрцах тых, хто ведаў спадара Аляксея Харкевіча.

Анджаліна Масальская



Wiktor Gomulicki w lecie 1907 roku przebywał na wczasach w guberni grodzieńskiej. Odwiedził w tym czasie kilka miejscowości, związanych z Adamem Mickiewiczem. Niestety, wycieczkom tym nie sprzyjała pogoda. Po jej ustaleniu się poeta zdecydował się odwiedzić Puszczę Białowieską. Do Białowieży dotarł w drugiej połowie sierpnia. To był akurat trudny okres dla Puszczy. Od czerwca tego roku służba leśna walczyła z nadmiernie rozmnożonym motylem – brudnicą...



У мінулым стагоддзі на Навагрудчыне жыў апантана-ўлюбёны ў свой родны край чалавек. Звалі яго Уладзімір Урбановіч (1921-1999). У 1960-1990 гадах гэты чалавек быў самым вядомым у Беларусі краязнаўцам, педагогам, вандроўнікам, калекцыянерам, музейшчыкам. А яшчэ – шчырым беларусам, дэлегатам Устаноўчага з'езда Таварыства беларускай мовы ў Мінску. Пра такіх людзей, якім быў Уладзімір Урбановіч, мы сёння пачалі забываць, мала прыгадваць іх... (далей у наступным нумары)

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316. **Zespół redakcyjny**: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Magdalena Pietruk (sekretarz redakcji), Tomasz Sulima, Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Joanna Czaban (Krynki), Siarhiej Czyhryn (Słonim), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn), Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Jan Maksymiuk (Praga), Mateusz Styrczula, Dorota Wysocka, Ewa Zwierzyńska.
Druk: Orthdruk, Białystok.



Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.
Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.
Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.
Numer złożono 28 maja 2015.